Камуністычная партыя (бальшавікоў) Беларусі

ЗЬВЯЗДА

Орган Цэнтральнага і Менскага Камітэтаў КП(б)Б

КАСТРЫЧНІК 14 1932 г. № 230 (4482)

Год выданьня XVI

Пралетары ўсіх краёў, злучайцеся!

Т.Т. СТАЛІН, МОЛАТАУ, ВАРАШЫЛАУ і ЯНСОН—ГЕРОЯМ АРКТЫЧНАЙ ЭКСПЭДЫЦЫІ

Ледакол „СИБИРЯКОВ", начальніку экспэдыцыі ШМІДТУ, капітану ледакола ВАРОНІНУ

Гарачае прывітаньне і віншаваньне ўдзельнікам экспэдыцыі, якія пасьпяхова вырашылі гістарычную задачу сквазнога плаваньня па Лёдавым акіяне ў адну навігацыю.

Посьпехі вашай экспэдыцыі, якая перамагла надзвычайныя труднасьці, яшчэ раз даказвае, што няма такіх цытадэляй, якіх не маглі-б узяць бальшавіцкая сьмеласьць і арганізаванасьць.

Мы ўваходзім у ЦВК Саюзу ССР з хадайніцтвам аб узнагародзе ордэнам Леніна і працоўнага сьцягу ўдзельнікаў экспэдыцыі.

СТАЛІН, МОЛАТАУ, ВАРАШЫЛАУ, ЯНСОН

БАРАЦЬБА ЗА ЗЯБЛІВА—БАРАЦЬБА ЗА ВЫСОКІ ЎРАДЖАЙ

Перад КП(б)Б стаіць задача — **крута па вярнуць сельскую гаспадарку БССР ад росту ў шырыню** да лепшай апрацоўкі глебы, павышэньня ўраджайнасьці. Колькасьць пасіва хутка перайсьці ў якасьць. Так і толькі так ставіцца зараз партыяй пытаньне.

Без лішніх слоў і разважаньняў прыступаць да непасрэднай справы, браць сёнешнія надзенныя аб'екты і на іх канцэнтраваць усю ўвагу. Якасьць — асноўнае ў рабоце партыйных, камсамольскіх і зямельна-калгасных арганізацый.

Канкрэтнасьць кіраўніцтва сельскай гаспадаркай патрабуе веданьня ўмоў кожнага раёну, сельсавету, калгасу і саўгасу. Быць на месцы ў гаспадарцы, вывучаць яе становішча з лічбамі і фактамі ў руках, знаць раён, калгас і людзей, рабіць правільны аналіз. Сваячасова дапамагаць адстаючаму вучастку, выцягваць яго, ставіць у рады перадавых.

Толькі пры такой сыстэме работы (а не пры кіраўніцтве наогул) можна з посьпехам ажыцьцяўляць пастановы ЦК і СНК «аб мерапрыемствах па павышэньні ўраджайнасьці». Умець апэрацыйна кіраваць, сваячасова прыслухоўвацца да прапаноў саміх калгаснікаў, падхапляць лепшы вопыт, пераносіць яго на ўсе раколічныя гаспадаркі.

Трэба ўмець заўжды ўхапіцца за асноўнае звяно і выцягнуць увесь ланцужок астатніх арганізацыйных мерапрыемстваў, зьвязаных з павышэньнем ураджайнасьці. Адным з такіх важнейшых зьвеньняў у барацьбе за высокі ўраджай, за арганізацыйна-гаспадарчае ўмацаваньне калгасаў выяўляецца правільны **севазварот.**

Навукова грунтаваны, правераны на вопыце севазварот, які пабудован у адпаведнасьці са спэцыялізацыяй гаспадаркі, дасьць магчымасьць упішнуць мэханічнага плянаваньня, павысіць ураджайнасьць тэхнічных культур, пашырыць кармовую базу жывёлагадоўчых раёнаў.

На працягу 1933 году севазвароты павінны быць уведзены ў кожнай гаспадарцы. Безумоўна, што пры мабілізаванасьці ўсёй КП(б)Б гэта будзе дасягнута і 1933 зьявіцца годам крутога пералому, пачнецца рост сельскай гаспадаркі ня ў шырыню, а ў глыбіню.

Калгас **імя Пакроўскага,** Дзяржынскага раёну, паказвае ўзор для калгасаў усёй БССР, як практычна пераключыцца на ажыцьцяўленьне важнейшай дырэктывы партыі і ўраду. Падхапіць пачын калгасу імя Пакроўскага, намеціць баявую праграму дзеяньняў на бліжэйшыя дні, дэкады, месяцы — абавязак кожнага калгасу, саўгасу і МТС.

Навукова-дасьледчыя ўстановы, аграспэцыялісты павінны ўсю сваю энэргію накіраваць на павышэньне ўраджайнасьці, увесь свой багаты практычны вопыт на ўжываньні агранаміі перадаць сацыялістычнаму сэктару сельскай гаспадаркі. Штодзённыя парады калгаснікам, канкрэтны паказ, як лепш увесьці севазварот, калі што пасеяць, якім гатункам, як апрацаваць глебу, якое і дзе ўжыць угнаеньне — вось на што павінна быць накіравана дзейнасьць агранома.

Пастанова ЦК і СНК патрабуе неадкладнага пераключэньня ўсіх партыйных, камсамольскіх і зямельна-калгасных арганізацый у напрамку барацьбы за павышэньне ўраджайнасьці. Якая задача перад партарганізацыямі стаіць у бліжэйшыя дні, дэкады? **Пераможна завяршаючы сяўбу азімых, кінуць усе сілы і сродкі на выкананьне плянаў зяблева, як аднаго з важнейшых агратэхнічных мерапрыемстваў** — вось на чым канцэнтруецца ўвага партыі.

БССР падыходзіць ужо да канца асеньняй пасеўнай кампаніі. На 10 кастрычніка засеяна **1.202 тыс.** га, або **88,4 проц.** Чатыры раёны (**Менскі, Тураўскі, Старобінскі, Парыцкі**) перавыкапалі пасеўныя плыны. 30 раёнаў засеялі звыш 90 проц. і набліжаюцца да сканчэньня пасеўнай. 31 раён засеяў ад 80 да 90 проц. і толькі дзесяць раёнаў, а іменна **Нараўлянскі** — 70,7 проц., **Бягомльскі** — 74,4 проц., **Расонскі** —76,1 проц. і інш. не дасягнулі нават 80 проц. у выкананьні пасеўных плянаў.

На Савецкай Беларусі не засеяна 158 тыс. га азімых. Кожны недасеяны гэктар—гэта ўдар па нашым збожжавым балянсе. Адстаючыя раёны, пакуль спрыяе надвор'е, могуць сеяць, яны павінны навярстаць прапушчанае.

Большасьць раёнаў з посьпехам завяршае сяўбу. Гэтага нельга сказаць пра зяблева. **Зяблева застаецца самым адсталым участкам ва ўсім ланцугу асеньня - палявых работ.** Вакол зяблева яшчэ не мабілізавана думка ўсёй пралетарскай, калгаснай гармадзкасьці. Некаторыя партарганізацыі ня здолелі правільна расставіць сілы на палявых работах, не ўсьвядомілі, што барацьба за поўнае выкананьне плянаў асеньняга ворыва, ёсьць барацьба за павышэньне ўраджайнасьці ў 1933 годзе.

Да 20 кастрычніка трэба ўзьняць 1.500 тыс. га. Сучасныя тэмпы стаяць над простую пагрозу 100 проц. выкананьне пляну. На 10 кастрычніка ўзьнята толькі 320 тыс. га, або 21,4 проц. Апошняя пяцідзеўка дала прырост на 72 тыс. га, замест 58 тыс. га мінулай пяцідзеўкі. Тэмпы прросту зусім марудныя, проста мізэрныя. Для таго, каб выканаць плян у вызначаны партыяй і ўрадам тэрмін, кожная наступная пяцідзеўка павінна даваць прырост мінімум у 500 тыс. га.

Асабліва ганебна адстаюць саўгасы, якія выканалі плян на 13,6 проц. Такіх тэмпаў цярпець больш нельга. **Саўгасы павінны паказаць узор барацьбы за высокі ўраджай, быць прыкладам для калгасаў ва ўжываньні агратэхнікі.** Саўгасы, як прадпрыемствы пасьлядоўна сацыялістычнага тыпу, маюць усе магчымасьці быць наперадзе ў часе асеньніх палявых работ. Саўгастрэсты нясуць перад партыяй поўную **адказнасьць** за 100 процантнае і сваячасовае выкананьне плянаў зяблева.

ЦК і СНК БССР у сваёй пастанове ад 16 жніўня прапазавалі «правесьці зяблева ў гаспадарках таварна-прамысловага гароднінцтва, забараніўшы пасеў гародніны ў агародніх саўгасах і калгасах вясной 1933 году не па зяблевым ворыве». Садова-гароднія раёны ня выканалі данай пастановы. Раёны асноўных пралетарскіх цэнтраў БССР зацягнулі зяблева. **Віцебскі** раён выканаў свой плян толькі на 16,2 проц., **Гомельскі** — на 22 проц., **Менскі**—на 27,1 проц. Тэмпы зусім не адпавядаюць тым запатрабаваньням, якія ЦК КП(б)Б укладае на дання партарганізацыі.

Посьпехі **Тураўскага** (96,9 проц.) і **Жыткавіцкага** (75,2 проц.) раёнаў паказваюць, што пры ўмелай арганізацыі працы, пры правільнай расстаноўцы сіл у кожным саўгасе і калгасе пляны можна выканаць раней вызначаных тэрмінаў. Трэба толькі адкінуць «тэорыю» чарговасьці кампаній, здолець мабілізаваць масы, наладзіць апэрацыйнае кіраўніцтва зяблевам.

Увесь трактарны парк і 70 проц. цягавай сілы на зяблева! — вось лёзунг сёнешняга дня. Разгарнуць сацспаборніцтва паміж саўгасамі, калгасамі, брыгадамі за добраякаснае і датэрміновае выкананьне плянаў зяблева. Паслаць у адстаючыя сельсаветы раённы актыў, усклясьці на іх адказнасьць за правільнае выкарыстаньне цягавай сілы, патрабаваць, каб адстаючыя гаспадаркі ў бліжэйшыя-ж дні былі выведзены ў лік перадавых.

Кастрычнік — асноўны месяц правядзеньня зяблева. Бягучая пяцідзеўка павінна даць круты пералом у павышэньні тэмпаў ворыва. **Па тэмпах прросту зяблева будзе ацэньвацца работа кожнай раённай партыйнай арганізацыі.**

ІНФАРМАЦЫЙНАЕ ПАВЕДАМЛЕНЬНЕ

13-га кастрычніка адбыўся чарговы пленум Менскага Гарадзкога Камітэту КП(б)Б сумесна з членамі ЦК КП(б)Б, ЦКК КП(б)Б, ГарКК і гарадзкім і гарнізонным партактывам.

У ганаровы прэзыдыум абрана Палітбюро ЦК УсеКП(б), а таксама т. т. ПОСТЫШАЎ, РУДЗУТАК, ТЭЛЬМАН і ЛЕНСКІ.

На пленуме з вялікім дакладам аб выніках верасьнёўскага пленуму ЦК УсеКП(б) і задачах Менскай партарганізацыі выступіў першы сакратар ЦК КП(б)Б тав. ГІКАЛО.

Пленум гаркому цалкам і поўнасьцю ўхваліў пастановы пленуму ЦК УсеКП(б) і пастанову ЦКК УсеКП(б) ад 9-га кастрычніка ў адносінах да контр-рэвалюцыйнай групоўкі Руціна, Галкіна, Іванова і інш., і заклікаў «усю партарганізацыю і кожнага члена і кандыдата партыі да павышэньня партыйнай пільнасьці, яшчэ большай ідэёвай згуртаванасьці вакол сваёго Ленінскага ЦК на чале з тав. СТАЛІНЫМ і жалезнай бальшавіцкай дысцыпліны ў барацьбе за пераможную генэральную лінію партыі».

Ад імя Менскай партарганізацыі пасланы прывітальная тэлеграма тав. СТАЛІНУ.

Рэзалюцыя і падрабязныя матэрыялы аб работах пленуму будуць апублікаваны ў друку ў бліжэйшы дні.

ПРА ХОД ІЛЬНАЗАГАТОВАК

Пастанова Савету Народных Камісараў БССР ад 4-X 1932 г.

Заслухаўшы даклад беларускай канторы Загатлён і ўпаўнаважанага камітэту па загатоўках аб ходзе ільназагатовак, Савет Народных Камісараў БССР адзначае, што:

а) ня гледзячы на спрыяючыя ўмовы ўборкі і расьцілу ільну, тэмпы разгортваньня загатовак яўна нездавальняючыя, асабліва па здачы трасты і саломы (замест 8.200 тон у верасьні, здана на 1-X 375 тон або 4,5 проц.);

б) пры поўным выкананьні верасьнёўскага пляну загатовак ільнасемя, пасаобныя раёны (Дрысенскі, які загатовіў 23 проц., Асьвейскі — 22,2 проц., Полацкі — 24,7 проц., Расонскі — 7,6 проц., Быхаўскі — 17,7 проц., Любаньскі — 13,8 проц., Парыцкі — 27,3 проц., Старобінскі — 4 проц., Чырвона-Слабодзкі — 25,4 проц., Плешчаніцкі—1,7 проц., Капыльскі — 21,3 проц., Пятрыкоўскі — 27,8 проц., Лельчыцкі — 22 проц. і Клічаўскі, які зусім не даў вестак), загатоўку ільнасемя ў верасьні сарвалі;

в) ручная апрацоўка ільну па ўсіх раёнах амаль не пачата і ні адзін раён верасьнёўскага пляну ня выканаў;

г) у калгасах, МТС і саўгасах тэмпы здачы ільнасемя ня вышэй, чым па калгасах, якія не абслугоўваюцца МТС;

д) надзвычай адстае аднаасобны сэктар, які выканаў верасьнёўскі плян толькі на 51,3 проц. па семі, прычым Белкантора Загатлён і РВК не арганізавалі ўліку як выкананьня абавязкаў кулацка-заможнымі гаспадаркамі па цьвёрдых заданьнях, так і дакладнага ўліку даных цьвёрдых заданьняў;

е) заводы першапачатковай апрацоўкі дрэнна падрыхтаваліся да прыёмкі і захаваньня трасты, што пагражае псаваньнем трасты ў калгасах, якія павінны здаваць не са сьцелішча непасрэдна на заводы (Полацк, Дуброўна, Копысь);

ж) Загатлён невыстарчальна ведае апарат у раёнах, па якіх загатоўка будзе весьціся праз спажывецкую кааперацыю, абмежаваўшыся фармальным складаньнем дагавораў з сельспажыўтаварыствамі і райзагатамі, не зацікавіўшыся становішчам іх ільназагатоўчага апарату. Са свайго боку, Белкаапсаюз зусім ня прымае пільных мер да пасаобных райсаюзаў, якія не згаджаюцца загатаўляць лён і заключаць дагаворы з Загатлёном (Магілеў, Вузда);

з) Беларуская кантора Загатлён і большасьць РВК пры давядзеньні пляну загатовак тэхкультур да сельсаветаў не наладзілі дакладнага ўліку даных цьвёрдых заданьняў.

Савет Народных Камісараў пастанаўляе:

1) Зацьвердзіць плян загатовак на кастрычнік месяц у наступным разьмеры:

а) ільну ў пераводзе на валакно — 6.535 тон, з тым ліку прастой — 17.550, саломай — 3.600 тон, а па сэктарох: саўгасы — 435 тон (у пераводзе на валакно), калгасы МТС — 230 тон, іншыя калгасы — 2.500 тон, аднаасобнікі — 1.300 тон;

б) ільнасемя — 8.315 тон, у тым ліку: саўгасы — 55 тон, калгасы МТС — 2.100 тон, іншыя калгасы — 2.600 тон, аднаасобнікі — 3.560 тон;

в) канаплянага семя — 330 тон, у тым ліку: саўгасы — 50 тон, МТС — 40 тон, іншыя калгасы — 95 тон, аднаасобнікі — 140 тон;

г) пенькасаломы — 1.100 тон, у тым ліку: саўгасы 800 тон, МТС — 60 тон, іншыя калгасы — 200 тон, аднаасобнікі — 40 тон.

Абавязаць Белкантору Загатлён, Белкалгасцэнтр і Беларускае аддзяленьне Трактарацэнтру забясьпечыць загатоўку звыш пляну тэй колькасьці ільнапродукцыі, якая пасаобных раёнах недазагатоўлена ў верасьні.

2. Улічваючы марудныя скачэньні будаўніцтва ільназаводаў, спыненьне работы 7 заводаў з прычыны пажару і непадрыхтаванасьці раду заводаў да прыёмкі трасты, пры значных астачах трасты і саломы ўраджаю мінулага году (11 тыс. тон на 1-IX), лічыць неабходным зьменшыць плян здачы трасты і саломы ільназаводам да разьмераў 13.100 тон, замест 14.500 тон (што будзе складаць 55 тыс. тон трасты і 4.840 тон саломы).

3. Папярэдзіць дырэктара Белтэкстрасту тав. Саракалетава аб прыняцьці рашучых мер да бесьперабойнай прыёмкі трасты на ільназаводах, а ўсім дырэктарам ільназаводаў указаць, што за малейшае затрыманьне ў прыёмцы трасты яны будуць прыцягнуты да суровай адказнасьці.

4. Абавязаць Беларускую кантору Загатлён, раённыя выканаўчыя камітэты, Беларускае аддзяленьне Трактарацэнтру, Белкалгасцэнтр павесьці растлумачальную працу ў калгасах аб пераапрацоўцы ўручную тэй колькасьці трасты, па якую памяншаецца здача заводам.

5. Абавязаць Беларускую кантору Загатлён і Белкаапсаюз у дэкадны тэрмін канчаткова ліквідаваць нявязку па складаньні дагавораў у раёнах і арганізацыю загатовак ільну праз сельспажыўтаварыствы.

6. Абавязаць раённыя выканаўчыя камітэты не пазьней 10 кастрычніка даслаць упаўнаважанаму камітэту па загатоўках дакладныя весткі аб давядзеньні пляну загатовак тэхкультур у разрэзе сельсаветаў, сэктароў і асабліва аб разьмеры даных цьвёрдых заданьняў.

7. Прапанаваць усім РВК не пазьней 10-X скончыць дачу цьвёрдых заданьняў кулацка-заможным гаспадаркам, устанавіўшы наступныя тэрміны выкананьня імі заданьняў: а) па ільне — да 15 сьнежня г. т., б) па пяньцы — да 1-I—33 г.

8. З прычыны нездавальняючай здачы ільну аднаасобным сэктарам, прапанаваць загатоўчым арганізацыям безадкладна прад'явіць да спагнаньня абавязацельствы кантрактантаў аднаасобнага сэктару па тэхкультурах, а на асабліва злосныя гаспадаркі, якія ня выконваюць сваіх абавязкаў па здачы ільну і насеньня па кантрактацыйных дагаворах, перадаваць справу ў суд.

9. Абавязаць дырэктароў саўгасаў (Горкі, Боркавічы і Бігосава) пад іх асабістую адказнасьць поўнасьцю здаць у кастрычніку вызначаную ім па пляну колькасьць ільнасемя і ільнасаломы.

10. Указаць Беларускаму аддзяленьню Трактарацэнтру на непармальнасьць такога становішча, калі калгасы, якія абслугоўваюцца МТС і маюць маныны, адстаюць у тэмпах здачы супроць іншых калгасаў.

11. Улічваючы выпадкі няўплаты грошай здатчыкам ільнянога семя, якія нагадваюцца да гэтага часу, з прычыны адсутнасьці грашовых знакаў (Талачын, Чавусы, Бялынічы, Крычаў, Рагачоў, Карма, Горкі, Прапойск, Клімавічы) абавязаць тав. Шэрмона (Дзяржбанк) ліквідаваць наяўныя перабоі ў выплаце грошай здатчыкам і да 10 кастрычніка г. т. ліквідаваць запазычанасьць.

12. Абавязаць дзяржаўную інспэкцыю на якасьці і ўпаўнаважанага камітэту загатовак СНА фарсаваць складаньне стандарту трасты на заводах, з абавязковым сканчэньнем складаньня іх не пазьней 15 кастрычніка г. г.

13. Абавязаць нам. упаўнаважанага НК шляхоў зносін тав. Эгле прыняць меры да бесьперабойнай падачы вагонаў на перавозку ільну і ільнасемя па залёках Загатільну.

14. Папярэдзіць усе раённыя выканаўчыя камітэты і, у прыватнасьці, Горацкі, Хойніцкі і Касьцюковіцкі, што ў выпадку непрадастаўленьня ільгот пасеўшчыкам ільну і канапель па збожжаздачы, згодна пастановы СНК БССР, вінаватыя будуць прыцягнуты да суровай адказнасьці. Адначасова абавязаць усе РВК папярэдзіць калгасы і аднаасобныя гаспадаркі, якія атрымалі ільготы па збожжазагатоўках, як пасеўшчыкі ільну і канапель, што ў выпадку невыкананьня ва ўстаноўленыя тэрміны вызначанага гэтым гаспадаркам пляну здачы прадукцыі ільну і пяньку, гэтыя гаспадаркі будуць пазбаўлены прадастаўленых ільгот па збожжазагатоўках.

15. Лічыць неабходным давесьці да ведама Савету Працы і Абароны аб адсутнасьці завозу збожжа для ільназдатчыкаў і слабым завозе прамтавараў.

16. Лічыць неабходным практыкаваць продаж тавараў авансам калгасам пад абавязацельствы здачы вызначанага па пляну валакна, ні ў якім разе не дапускаючы разбазарваньня фондаў стымуляваньня ільназагатовак на іншыя мэты.

У сувязі з магчымым перавыкананьнем пляну ў адным раёне і недавыкананьнем яго ў другім раёне і для ацэнтраваньня тавараным фондамі па стымуляваньні ільназагатовак, даручыць Белкаапсаюзу і Белканторы Загатлён стварыць манэўровы рэзэрв для гэтай мэты ў разьмеры да 25 проц. ад агульнага фонду мэтавага прызначэньня.

17. З прычыны невыкананьня радам райвыканкомаў (Магілеў, Тураў, Чашніцкі, Чавусы, Сеньна, Ветка) пастановы СНК і ЦК КП(б)Б ад 10-VIII—31 г. аб недапушчальнасьці перагібкі работнікаў Загатільну на другія работы і аб забесьпячэньні Загатільну складачнымі памяшканьнямі, папярэдзіць усе раённыя выканаўчыя камітэты, і ў прыватнасьці, пералічаныя вышэй, аб недапушчальнасьці аслабленьня апарату Загатільну і перачы яго складачных памяшканьняў.

18. Лічыць неабходным, каб рэдакцыі газэт штодзённа асьвятлялі ў друку ход загатоўкі і першапачатковай апрацоўкі ільну і пяньку.

Старшыня Савету Народных Камісараў БССР М. ГАЛАДЗЕД.

Нам. кіраўніка спраў Савету Народных Камісараў і Эканамічнага Савету БССР Ф. СУЛКОЎСКІ.

УВЕСЬ ТРАКТАРНЫ ПАРК і 70 проц. КОНЯЙ—НА ЗЯБЛІВА!

ХОД ЗЯБЛІВА ПА БССР (у га і процантах)

ГАДЫ	ПЛЯН	На 30 верасьня		На 5 кастрычніка		На 10 кастрычніка	
1932	1.500.000	190.513	12,7	248.551	16,6	320.972	21,4
1931	1.670.000	228.209	13,7	254.688	15,3	317.832	19

АБ ХОДЗЕ ЗЯБЛІВА

Пастанова сакратарыяту Менскага гаркому КП(б)Б

Ня гледзячы на ўсю выключную важнасьць сваячасовага выкананьня зяблева, як аднаго з галоўнейшых аграмерапрыемстваў па павышэньні ўраджайнасьці і на неадназразовыя пастановы бюро гаркому аб фарсаваньні зяблева, плян зяблева па 1-X — выканан на 11,6 проц. Прычым саўгасамі плян зяблева выкананы на 10,6 проц. і калгасамі — 8,4 проц.

У асобных сельсаветах да зяблева амаль што ня прыступлена: Калодзішчанскі — 7 га, Бораўскі—3 га, Абчацкі—38 га. Замастоцкі—43 га і Падгайскі—55 га. Такія слабыя тэмпы зяблева па раёну і ганебнае адставаньне адзначаных сельсаветаў сакратарыят тлумачыць толькі тым, што сельпартячэйкі і сельсаветы ня здолелі арганізаваць увагі калгаснікаў, рабочых саўгасаў і аднаасобных бядняцка-серадняцкіх гаспадарак на зяблева. Выкананьне пляну зяблева ня было ўвязана з падрыхтоўкай і правядзеньнем асеньняй сяўбы, у выніку чаго такая важнейшая гаспадарча-палітычная кампанія як зяблева была пушчана на самацёк.

Выходзячы з гэтага сакратарыят гаркому КП(б)Б пастанаўляе:

1. Абавязаць дырэктароў саўгасаў і дырэктароў МТС зараз жа ўвесь трактарны парк пераключыць выключна на зяблева і падняцьце цаліны, выходзячы з работы ў дзьве зьмены.

2. Абавязаць дырэктароў саўгасаў, МТС і фракцыі РКС пераключыць на зяблева да 10-X ня менш 50 проц. і пасьля 10-X — 70 проц. наяўнай конскай цягавай сілы.

3. Сельпартячэйкам і сельсаветам мабілізаваць увагу калгаснікаў, рабочых саўгасаў і аднаасобных бядняцка-серадняцкіх гаспадарак на ліквідацыю прарыву па зяблеву, правільна арганізаваўшы работу пастаянных вытворчых брыгад, даўшы адпаведныя заданьні кожнай брыгадзе, шырока разгарнуўшы мэтады сацспаборніцтва і ўдарніцтва паміж калгасамі, брыгадамі і пасобнымі калгаснікамі.

Сакратарыят абавязвае сельпартячэйкі, сельсаветы, дырэктароў МТС забясьпечыць работу па зяблеву такімі тэмпамі, каб плян зяблева быў абавязкова і поўнасьцю выкананы не пазьней 20 кастрычніка.

4. Сакратарыят папярэджвае сельпартячэйкі і старшынь Калодзішчанскага, Бораўскага, Абчацкага і Замастоцкага сельсаветаў, што калі ў бліжэйшыя дні ня будзе дасягнут рэзкі пералом па зяблеву, дык да вінаватых будуць прыняты суровыя меры партыйных спагнаньняў.

Сакратар Менгаркому КП(б)Б ШПЭКТАРАЎ.

Сяўбу сарвалі, зяблева не пачыналі

КЛІЧАЎ. У саўгасе **«Астравы»** Сьвінгаводтрэсту з прычыны адсутнасьці штодзённага кантрэтнага і апэрацыйнага кіраўніцтва з боку партячэйкі і рабочкому, **плян сяўбы і зяблева зрываюцца.**

Саўгас мае 37 рабочых коняй, 6 трактараў. Здавалася-б, што такая наяўнасьць цягавай сілы поўнасьцю забясьпечвае сваячасовае выкананьне пляну. На справе-ж маем зусім адваротнае. **Плян сяўбы выкананы на 70 проц. Зяблева зусім не распачата,** ня гледзячы на даволі значны плян — **360 гэкт.**

Дырэкцыя саўгасу замест мабілізацыі рабочых на ліквідацыю наяўнага прарыву, займаецца голым адміністраваньнем і пагрозамі. Меў месца нават такі выпадак, калі работчага-трактарыста **Казачонка** адміністрацыя сваімі пагрозамі давяла да сьлёз замест таго, каб даць яму на яго запытаньне правільны адказ.

Культурна-масавая работа сярод рабочых адсутнічае. Пасяджэньні трыкутніка і рабочкому не праводзяцца. Старшыня рабочкому замест выкананьня сваіх простых абавязкаў, наладжвае на сваёй кватэры вечарынкі і гульню ў карты.

Спэцвопраткай і прамтаварамі рабочыя не забясьпечваюцца. Прамтавары, якія дасылаюць саўгасу, дырэктар разьмяркоўвае па сваім гледжаньні. Пры разьмеркаваньні лепшая мануфактура раздаецца «начальству» саўгасу. Дырэктар саўгасу накрыўдканым таксама не застаецца.

Такія «клопаты» дырэкцыі аб паляпшэньні культурна-бытавых умоў прывялі да цяжкасьці рабочай сілы. **14 лепшых трактарыстаў пакінулі саўгас.**

Аднаведныя раённыя арганізацыі павінны зараз-жа прыняць належныя меры да аздаравленьня саўгасу, і прыцягнуць да адказнасьці канкрэтных вінаватых.

П

ЧОРНАЯ ДОШКА

За ганебныя тэмпы і невыстарчальную барацьбу за зяблева, што значна адбіваецца на ўраджайнасьці сацыялістычных палёў, пакідаем на чорнай дошцы раней занесеныя раёны:

Па паўночнай зоне (сярэдні процант выкананьня—11)

1) **АСЬВЕЙСКІ** — 4,5 проц., 2) **ВУШАЦКІ** — 4,5 проц., 3) **РАСОНСКІ** — 4,7 проц., 4) **ЧАШНІЦКІ** — 5,6 проц.

Па цэнтральнай зоне (сярэдні процант выкананьня—24)

1) **БЯГОМЛЬСКІ** — 3,6 проц., 2) **КРУПСКІ** — 6,9 проц., 3) **ПРАПОЙСКІ** — 8,5 проц., 4) **ТАЛАЧЫНСКІ** — 9,3 проц.

Па паўднёвай зоне (сярэдні процант выкананьня—26,6)

1) **УВАРАВІЦКІ** — 12,3 проц., 2) **ЖЛОБІНСКІ** — 15,4 проц., 3) **РЭЧЫЦКІ**—15,8 проц.

Дадаткова заносім: 1) **КАМАРЫНСКІ** выканаў плян на 9,3 проц.

ЗДЫМАЕМ З ЧОРНАЙ ДОШКІ

1. Кармянскі раён, які даў прырост за апошнюю пяцідзеўку на 24,1 проц. і перайшоў з 25-га на сёмае месца па паўднёвай зоне.

Зводка НКЗБ

аб узьняцьці зяблева і ходзе сяўбы азімых па БССР на 10 кастрычніка 1932 г.

№№ п. п.	РАЁНЫ	У проц. да пляну: Зяблева	Засеяна
	ПАЎНОЧНАЯ ЗОНА		
1.	Сенненскі	25,0	88,2
2.	Аршанскі	21,6	94,5
3.	Суражскі	21,6	85,9
4.	Віцебскі	16,5	90,7
5.	Сіроцінскі	15,1	85,6
6.	Лёзьнянскі	12,9	90,6
7.	Бешанковіцкі	12,7	78,3
8.	Гарадоцкі	10,8	85,1
9.	Дрысенскі	10,6	72,3
10.	Дуброўенскі	10,0	87,0
11.	Чашніцкі	5,6	83,3
12.	Полацкі	5,6	82,6
13.	Лепельскі	5,2	82,6
14.	Расонскі	4,7	76,1
15.	Вушацкі	4,6	90,7
16.	Асьвейскі	4,5	76,0
	Разам па зоне	**11,0**	**84,9**
	ЦЭНТРАЛЬНАЯ ЗОНА		
1.	Вузьдзенскі	45,8	88,0
2.	Чэрвеньскі	43,9	95,4
3.	Чырвона-Слабодзкі	41,9	99,9
4.	Смалявіцкі	40,4	85,5
5.	Клічаўскі	38,5	95,8
6.	Стара-Дарожкі	34,2	97,1
7.	Капыльскі	33,4	85,2
8.	Шклоўскі	32,4	90,7
9.	Чырвонапольскі	31,4	85,0
10.	Слуцкі	30,2	95,3
11.	Дзяржынскі	28,5	84,0
12.	Менскі	27,1	100,6
13.	Пухавіцкі	27,1	91,3
14.	Клімавіцкі	26,8	90,2
15.	Касьцюковіцкі	26,6	78,6
16.	Заслаўскі	26,4	81,1
17.	Бярэзінскі	25,5	95,6
18.	Быхаўскі	24,4	83,3
19.	Чаўускі	23,8	92,2
20.	Крычаўскі	22,4	77,5
21.	Магілеўскі	22,3	90,0
22.	Мсьціслаўскі	21,8	94,6
23.	Асіповіцкі	20,4	85,9
24.	Барысаўскі	19,8	92,9
25.	Лагойскі	19,4	96,9
26.	Бялыніцкі	18,0	91,9
27.	Чэрыкаўскі	17,3	84,8
28.	Горацкі	16,6	87,9
29.	Плешчаніцкі	13,0	85,3
30.	Талачынскі	9,3	82,4
31.	Прапойскі	8,5	89,3
32.	Крупскі	6,9	88,0
33.	Бягомльскі	3,6	74,4
	Разам па зоне:	**24,0**	**83,8**
	ПАЎДНЁВАЯ ЗОНА		
1.	Тураўскі	96,9	100,1
2.	Жыткавіцкі	75,2	98,4
3.	Брагінскі	39,6	82,3
4.	Рагачоўскі	38,7	99,5
5.	Пятрыкоўскі	38,3	91,8
6.	Чачорскі	35,5	99,9
7.	Кармянскі	31,9	94,1
8.	Старобінскі	31,3	100,5
9.	Любаньскі	30,3	89,1
10.	Бабруйскі	30,7	96,0
11.	Хойніцкі	29,9	88,0
12.	Мозырскі	27,6	91,1
13.	Шарыцкі	26,9	100,1
14.	Ельскі	25,3	80,6
15.	Нараўлянскі	23,8	70,7
16.	Глускі	23,1	93,5
17.	Лоеўскі	22,2	80,4
18.	Гомельскі	22,0	69,7
19.	Буда-Кашалёўскі	19,0	93,2
20.	Лельчыцкі	17,6	97,1
21.	Рэчыцкі	15,8	79,7
22.	Жлобінскі	15,4	81,4
23.	Веткаўскі	14,7	90,8
24.	Церахаўскі	14,2	88,1
25.	Уваравіцкі	12,3	87,3
26.	Камарынскі	9,3	79,7
	Разам па зоне:	**26,6**	**90,2**
	Разам па БССР:	**21,4**	**88,4**

Кіраўнік пасоўбюро НКЗБ — ТАРАСЕВІЧ.

АБ ВЫНІКАХ ВЕРАСЬНЁУСКАГА ПЛЕНУМУ ЦК І ЗАДАЧАХ МАСКОУСКАЙ АРГАНІЗАЦЫІ

З дакладу тав. КАГАНОВІЧА на пленуме МК і МГК сумесна с сакратарамі райкомаў вобласьці і актывам Маскоўскай арганізацыі УсеКП(б) 8 кастрычніка 1932 г.

Таварышы, верасьнёўскі пленум Цэнтральнага Камітэту нашай партыі абмеркаваў, як вы ўжо ведаеце з апублікаваных рэзалюцый, тры пытаньні: аб разьвіцьці савецкага гандлю, аб вырабе тавараў шырокага спажываньня і аб разьвіцьці чорнай мэталюргіі. Па ўсіх гэтых пытаньнях пленум заслухаў справаздачныя даклады адпаведных наркаматаў (НКСнабу, Наркамлёгпраму, Наркамцяжпраму) і арганізацый (Цэнтрасаюзу і Усекаапрамсавету), а таксама судаклады РСІ

Гэта ўказвае на тое, што абмеркаваньне такіх надзвычайна важных пытаньняў, як работа чорнай мэталюргіі, як савецкі гандаль, выраб прадметаў шырокага спажываньня, паляпшэньне працоўных гораду і вёскі, а таксама далейшае ўмацаваньне змычкі рабочай класы з працоўным сялянствам, вялося з пункту гледжаньня канкрэтнай праверкі выкананьня тых пастаноў і дырэктыў, якія прымаліся нашай партыяй і яе Цэнтральным Камітэтам, праверкі таго, як на справе ажыцьцяўляецца генэральная лінія нашай партыі. Мы ўступілі ў такую пасаду, калі барацьба за генэральную лінію партыі і праверка яе ажыцьцяўленьня праводзяцца ня столькі ў агульных рэзалюцыях і на агульных і ўсё абымаючых пытаньнях, колькі ў практычнай штодзённай рабоце на асобных канкрэтных вучастках сацыялістычнага будаўніцтва. Тым больш гэта адносіцца да пытаньняў, якія стаялі на даным пленуме, бо яны маюць самую непасрэдную сувязь з нашай барацьбой па ажыцьцяўленьні генэральнай лініі партыі. У тых пытаньнях, якія стаялі на пленуме, і ў прынятых пленумам пастановах знайшла найбольш яркае адлюстраваньне лінія нашай партыі і яе ЦК, уся наша палітыка. Пастановы па пытаньнях чорнай мэталюргіі, па шырспажыве і савецкім гандлі ўяўляюць адзінае цэлае, уяўляюць сабой тую суму задач, на якіх сканцэнтраваў сваю ўвагу Цэнтральны Камітэт партыі, на вырашэньне якіх ён мабілізуе ўсе сілы, усю волю і энэргію партыі, беспартыйных рабочых мас і калгасьнікаў.

Дабіўшыся ў барацьбе з трацкістамі і правым ухілам рашаючых посьпехаў у справе калектывізацыі і ўмацаваўшы тым самым у вялізарнай меры саюз рабочай класы і працоўнага сялянства, на аснове вытворчых форм змычкі, мы атрымалі цяпер магчымасьць яшчэ больш умацаваць гэты саюз на аснове разгортваньня савецкага калгаснага гандлю. Дабіўшыся буйнейшых посьпехаў у справе разьвіцьця цяжкай індустрыі, мы атрымалі магчымасьць, разьвіваючы і надалей хуткімі тэмпамі цяжкую індустрыю і ў асаблівасьці чорную мэталюргію, максымальна разгортваць лёгкую індустрыю і павялічваць выраб прадметаў шырокага спажываньня. Разгортваньне савецкага гандлю, павялічэньне тавараабароту мы рядзем на аснове рашучай барацьбы супроць прыватніка, нэпмана, спэкулянта. Іменна таму, што мы адхілілі лінію, якую прабавалі нам навязаць трацкісты і правыя апартуністы, лінію адпаўленьня капіталізму, іменна таму, што мы дабіліся рашаючых посьпехаў у галіне індустрыялізацыі і калектывізацыі краіны, надвялі моцную базу цяжкай індустрыі, базу мэталюргіі, машынабудаўніцтва, электрычнасьці, хэміі і г. д. пад нашу гаспадарку, іменна таму, што мы дабіліся рашаючых посьпехаў у сваім разгорнутым сацыялістычным наступленьні на кулака, нэпмана, спэкулянта,—мы атрымалі магчымасьць ставіць ва ўсю велічыню і практычна вырашаць такія задачы, як разьвіцьцё лёгкай індустрыі, выраб шырспажыву, разгорваньне савецкага гандлю і ўмацаваньне гандлёвых форм змычкі гораду з вёскай. Пастановы пленуму ЦК мабілізуюць партыю, рабочую класу і калгасьнікаў на вырашэньне новых практычных задач у барацьбе за генэральную лінію партыі, за пераможнае сканчэньне першай пяцігодкі. Пастановы пленуму ўліваюць новыя сілы, бадзёрасьць і энэргію ў мільённыя масы і заклікаюць іх, адкідваючы прэч усіх ныцікаў, усіх апартуністаў, згуртавацца яшчэ цясьней вакол ленінскага ЦК нашай партыі для далейшага перамаганьня труднасьцяй і барацьбы за сацыялізм (Бурныя аплёдысмэнты).

Аб вырабе шырспажыву, рабоце прамысловасьці і прамкаапэрацыі

Тав. Сталін на XVI зьезьдзе партыі ўказаў, што «новае ў разьвіцьці нашай прамысловасьці заключаецца, між іншым, у тым, што мы маем цяпер магчымасьць разьвіваць паскораным тэмпам і цяжкую і лёгкую індустрыю».

За апошнія гады мы маем вядомы зрух ў разьвіцьці лёгкай прамысловасьці. На базе вялізарнага росту цяжкай прамысловасьці, рэканструкцыі сельскай гаспадаркі і росту тэхнічных культур мы стварылі магчымасьць хуткага разгортваньня таксама і лёгкай прамысловасьці як у адносінах павялічэньня аб'ёму яе прадукцыі (рост у 1931 г. у параўнаньні з 1928 годам на 71 проц.), так і рэканструкцыі яе тэхнічнай базы. Асабліва ўзрасьлі: швэйная прамысловасьць—на 276 проц., трыкатажная—на 140 проц., абутковая—на 266 проц., і скурная—на 134 проц. у 1931 г. у адносінах да 1928 году. Але мы маем яшчэ больш гіганцкі рост патрэб краіны, рост патрэб рабочых і калгасьнікаў. У той-жа час рост цяжкай індустрыі выклікаў вялізарны рост, праўда, часта перапавялічаны, попыту прадметаў лёгкай індустрыі для прамысловага спажываньня.

Пры агульным росьце таварнай прадукцыі ў 1931 г. у параўнаньні з 1930 годам на 11 проц., рынчны фонд павялічыўся на 5 з пал. проц., а ня рыначнае спажываньне на 27 проц. Таму ЦК, распрацоўваючы праграму павялічэньня шырспажыву, у першую чаргу паставіў з усёй вострасьцю пытаньне аб скарачэньні на-за рыначнага спажываньня.

У некаторых галінах прамысловасьці, на прыклад у гумавой, часта не разьлічвалі, колькі ўходзіць трыкатажу і мануфактуры для падкладкі ў галёшы, ня лічылася, што калі вырэзаць больш удала, то з гэтага-ж кавалку можа выйсьці больш. Вазьміце «Каучук», «Красный богатырь» і вы ўбачыце, якая колькасьць абрэзкаў мануфактуры валяецца там.

Тав. Кагановіч прыводзіць падрабязныя лічбы скарачэньня нярыначнага спажываньня на 1932 год і павялічэньня рыначных фондаў.

На 12 пляную мых таварах (бавоўнянапаяровыя тканіны, шарсьцяныя тканіны, ніткі, хусткі, трыкатаж, швэйныя вырабы, скураны абутак, галёшы, папяросы, махорка, мыла гаспадарчае, мыла туалетнае) адгрузкі рынку (горад і вёска) за 9 месяцаў 1932 году павялічыліся на 18 проц. больш адпаведнага перыяду мінулага году.

ЦК даў строгую дырэктыву—у першую чаргу адгружаць тавары шырспажыву рынку, і ў асаблівасьці ў вёску. На працягу апошняга паўгодзьдзя і асабліва па працягу апошняга кварталу мы далі больш тавараў вёсцы і, калі можна так сказаць, «пакрыўдзілі» гарады. Мы на гэта пайшлі зусім сьвядома, бо для сапраўднага разьвіцьця калгаснага гандлю неабходна, каб калгасьніку даць прамысловыя тавары.

У вырабе прадметаў шырокага спажываньня мы ў першую чаргу сутыкаемся з сырцовай базай. Возьмем пытаньне аб бавоўне. У Расію да рэвалюцыі ўвозілася з-за мяжы бавоўны да 200 тыс. тон у год. На імпарт бавоўны траціла валюту і мы. Партыя павяла ўпартую барацьбу за стварэньне бавоўнянай базы і ў сучасны момант мы ўласную бавоўняную базу стварылі

У гэтым годзе мы павінны атрымаць і атрымаем, трэба спадзявацца, 27-28 млн. пудоў сваёй бавоўны, не затрачваючы на ўвоз яе з-за мяжы золата.

Спасыланьні гаспадарнікаў лёгкай індустрыі на адсутнасьць сырцу ў IV квартале ня вытрымліваюць ніякай крытыкі.

Гутаркі і спасыланьні на недахоп сырцу тым больш нягрунтоўныя для галін прамысловасьці, працуючых па такім сырцу, як дрэва (мэблявая, лыжкарная і інш. галіны дрэваапрацоўчай прамысловасьці), гліна (гончарная, фарфарафаянсавая і інш. вытворчасьці) і. нарэшце, уціль. Мы маем рад галін прамысловасьці, якія працуюць у значнай частцы на уцільсырцу. Многіх з вас напоўна, зьдзівіць, калі я скажу, што шарсьцяная прамысловасьць можа працаваць на 50 проц. на уцільсырцу, напяровая прамысловасьць—на 25 проц. на уціль. Ватная і катанінная прамысловасьць—22-25 проц. уцілю, гумавая прамысловасьць—на 35 проц. уцілю, толевая—на 80 проц., галянтэрэйная ў пераважнай частцы—на ўціле.

Наша задача заключаецца ў тым, каб мы ў барацьбе за шырспажыў разгарнулі ўсю творчую ініцыятыву мас і накіроўвалі яе ня толькі на вялікія справы, але і на так званыя «малыя справы», якія набываюць вялікае значэньне. Той, хто не разумее, што зараз важнейшая палітычная задача—вырабіць больш целагрэек, больш галёш, каб даць рабочым і сялянам, вырабіць зараз больш паперы, абутку і іншых тавараў, той, хто не разумее, што для гэтай работы неабходна засучыць рукавы, не баяцца брудной работы, не баяцца дробязяй, не аб мяжоўваецца агульнымі рэзалюцыямі, хто ня хоча займацца такімі канкрэтнымі справамі, той не бальшавік, ня ленінец, той не праводзіць генэральнай лініі партыі, колькі-бы ён ні даказваў адданасьць ёй на словах.

Мы павінны зараз, у прыватнасьці, па Маскве, паставіць перад сабой задачу: на зіму даць рабочаму цёплую вопратку. Калі ў яго ёсьць цёплая вопратка, але якую трэба адрамантаваць, яе яму трэба адрамантаваць, трэба даць дзецям цёплую вопратку, абутак. Колькі ў нас прападае старых валёнак? Колькі ў нас прападае ўсякай грубай шэрсьці па гарадох і вёсках?

Старую шэрсьць можна выкарыстаць, калі мы, напрыклад, для Масквы заключым сваячасова дагаворы з саматужнікамі Сямёнаўскага раёну, Горкаўскага краю (ды і ў нас у Маскоўскай вобласьці ёсьць такія саматужнікі) і дамо масе рабочых, работніц дадатковa некалькі соцень тысяч пар цёплага абутку на зіму. Няўжо гэта ня будзе сапраўдны, патрэбнай справай?

Таварышы вобласьнікі,—а тут прыступічаюць усе сакратары райкомаў Маскоўскай вобласьці,—я зварачаю вашу ўвагу на тое, што Маскоўская вобласьць займае выключна вялікае месца па саматужнай прамысловасьці. Да вайны сельскія саматужнікі на тэрыторыі Маскоўскай вобласьці выпускалі прадукцыі да 400 млн. руб. у год, а зараз 35-40 проц. даваеннага. Многія неяк лічаць нястотным саматужны промысел, тады як ён дае на сотні мільёнаў руб. шырспажыву рынку, а для калгасаў дадатковую прадукцыю і даход. Вось чаму на гэту справу трэба зьвярнуць выключную ўвагу, усямерна разьвіваць саматужныя арцелі ў Маскоўскай вобласьці.

Адна Маскоўская вобласьць па радзе галін можа ў бліжэйшым годзе падвоіць колькасьць прадметаў шырспажыву, якія выпускаюцца ў даны момант нашай саматужнай каапэрацыяй. Гэта—наша галавая задача, якую мы павінны вырашыць.

Мы па ўсёй краіне павінны зараз разгарнуць максымальную ініцыятыву кожнага раёну, кожнага кіраўніка саматужнай арцелі, заахвочваць ініцыятыву, ліквідаваць ганарлівасьць, бюракратычную нагардлівасьць да пытаньняў вытворчасьці, быту і абслугоўваньня саматужнікаў. Трэба ўсямерна падтрымаць саматужніка ня толькі тым, што мы яму заплацім за прадукцыю, а вы ведаеце з пастановы ЦК, што яму дазволена прадаваць сваю прадукцыю па больш дарагой цане,—але і штодзённай увагай і дапамогай, якія адыгрываюць вельмі вялікую ролю.

Чаму, напрыклад, на старонках друку не асьвятляецца работа саматужных арцеляй—лепшых, горшых? Чаму ўдарнікі саматужнай прамысловасьці не адзначаюцца ў газэце? Гэта павінна адыграць вялікую ролю ў стымуляваньні работы саматужнікаў і іх арцеляй.

Нездавальняючасьць работы ў галіне вырабу шырспажыву, падкрэсьленая пленумам, адносіцца, зразумела, і да Маскоўскай вобласьці. Па Маскоўскай вобласьці лёгкая прамысловасьць выканала план за 8 месяцаў на 88 проц., а па адной Маскве за 9 месяцаў—на 91,7 проц. Мы маем поўную магчымасьць у IV квартале, як мы гэта зрабілі ў мінулым годзе, ня толькі выканаць квартальны план, але і навярстаць упушчанае і выканаць хоць-бы частку пляну, невыкананага за папярэдзія тры кварталы.

Мы патрабуем, каб усе кіраўнікі, гаспадарнікі і рабочыя лёгкай індустрыі Маскоўскай вобласьці ў IV квартале паказалі ўзоры барацьбы за выкананьне пастаноў ЦК па вырабу прадметаў шырокага спажываньня і ў асаблівасьці па тэкстылю. Маскоўская-ж вобласьць дае больш паловы прадукцыі СССР па бавоўняна-паяровых тканінах (54 проц.), трыкатажы (55 проц.), шэрсьці (60 проц.), ¾ прадукцыі па поўку, значную частку швэйных вырабаў, абутку, галянтэрэі. Адначасова, каб забясьпечыць выкананьне прамфінпляну па шырспажыве, мы павінны ўзмацніць увагу да абслугоўваньня патрэб лёгкай прамысловасьці і ў асаблівасьці да пытаньняў рабочага быту.

У пастановах пленуму Цэнтральнага Камітэту партыі шмат увагі аддаецца тэкстыльнай прамысловасьці. Павышаецца зарплата тэкстыльшчыкам у сярэднім на 15,9 проц. Мы павінны асабліва ў тэкстыльнай прамысловасьці выключную ўвагу аддаць клопатам аб рабочых (паляпшэньне сталовых і т. д.).

Пры выкананьні прамфінпляну па шырспажыве, у асаблівасьці па тэкстыльнай прамысловасьці, мы павінны ўнікаць тых памылак, якія былі дапушчаны ў апошнія гады. Я маю на ўвазе так званую функцыяналку.

У мінулым годзе прышлі да нас гаспадарнікі і паставілі пытаньне аб увядзеньні функцыяналкі, г. зн. аб падзеле прафэсіі ткача, прадзільшчыка па асобных апэрацыях. Калі раней ля ткацкага варштату стаяла адна ткачыха, то пры функцыяналцы ўвялі такія спэцыяльнасьці: заводчыца, асноўшчыца, пускальшчыца, адрыўшчыца, зарадчыца. Што ад гэтага атрымалася? Ад гэтага атрымалася, па-першае, паўнейшая дыскваліфікацыі рабочых, ліквідавалі ткача, ліквідавалі прадзільшчыка, многіх спэцыялістаў рабочых замянілі некваліфікаваныя рабочыя, якія справіцца з варштатам ня могуць, якія бегаюць ад аднаго варштату да другога.

Пры адсутнасьці інструктажу, без падрыхтоўкі, без сапраўдных чалядзікаў і кіраўнікоў увядзеньне гэтай функцыяналкі азначала прыкладна такую-жа памылку, як у свой час абязьлічка паравозаў.

Мы ў Маскоўскім камітэце партыі рашуча супраціўляліся ўвядзеньню функцыяналкі, выказаліся супроць далейшага ўвядзеньня функцыяналкі. Хаця ў нас асноўную масу ткацкіх цэхаў функцыяналка не ахапіла але ўсё-ж частка была пераведзена, і ў астатніх ткачоў ня было ніякай упэўненасьці, што ў бліжэйшы-жа час іх не перавядуць на функцыяналку. У рэзультаце гэта функцыяналка дэзарыентавала кадры тэкстыльнай прамысловасьці. Пленум Цэнтральнага Камітэту вынес пастанову: скасаваць функцыяналку ў тэкстыльнай прамысловасьці. Я пераконан, што тэкстыльшчыкі гэта ўхвалялі, за выключэньнем заядлых «функцыяналаў». (Сьмех).

Пленум ЦК, заслухаўшы справаздачы Наркамснабу, Цэнтрасаюзу і судаклад ЦКК, канстатаваў, што мы маем усё яшчэ нездавальняючую работу гандлёвых органаў, хаця і ёсьць некаторыя посьпехі ў справе разгортваньня гандлёвай сеткі; толькі за 7 месяцаў 1932 году па лініі Наркамснабу і Цэнтрасаюзу адкрыта 20,2 тыс. магазынаў і 28,6 тыс. палатак і ларкоў. Па адной Маскве за 7 месяцаў мы маем павялічэньне на 3.576 гандлёвых пунктаў (279 магазынаў, 1.494 палатак і ларкі, 1.103 латкі, 700 рыначных месц). Аднак, да гэтага часу яшчэ вельмі нізкім. Да гэтага часу засылаюць яшчэ тавары на туды, куды трэба. Мы змагаемся таксама з лішнім браніраваньнем тавараў. Паводле дырэктыў ЦК доля браніраваных тавараў на вёсны зьнізілася з 23,1 проц. у 1931 г. да 9,5 проц. у 1932 г., але фактычна гэта броня была значна вышэй, бо вылазіла праз іншыя каналы.

Наша задача заключаецца ў тым, каб мы з вамі ў штодзённай рабоце па прыкладу Цэнтральнага Камітэту заняліся сапраўднай праверкай выкананьня прынятых пастаноў. Работу гандлёвай сеткі мы можам і павінны палепшыць. Тавараў у нас ня мала. Задача заключаецца ў тым, каб правільна арганізаваць іх размеркаваньне, правільна накіраваць праз тавараправодзячую сетку да спажыўца.

Важнейшае пытаньне зараз — гандлёвыя кадры. Колькі-б мы ні выносілі рэзалюцый, калі мы ня рушым у каапэрацыю і гандлёвыя органы новыя, моцныя кадры, справы не палепшым. Калі гутарка заходзіць аб каапэрацыі і снабжэньні, многія незадаволены іх работай, але знаходзіцца частка кампэтэнтаў ня хоча туды ісьці працаваць. Я думаю, таварышы, што ў многіх партыйцаў ёсьць значная недаацэнка таго, што сёньня мае асаблівую вострасьць, неразуменьне таго палітычнага значэньня, якое маюць у нас пытаньні снабжэньня і разгортваньня савецкага гандлю.

Калгасны гандаль у нас да гэтага часу яшчэ па-сапраўднаму не разгорнут. Гэта проста прызнаць. Праўда, па Маскве, мы маем з месяца ў месяц рост зваротаў калгасьнікаў на маскоўскіх рынках, але ён зусім нездавальняючы.

Невыстарчальнае разгортваньне калгаснага гандлю тлумачыцца слабасьцю масава-арганізацыйнай і палітычнай работы нашых сельскіх арганізацый, кэспасьцю і непаваротлівасьцю раду зьвеньняў гандлёвага апарату, а таксама кулацкім супраціўленьнем.

Цэнтральная задача — гэта арганізацыя і разгортваньне савецкага калгаснага гандлю, як важнейшага вагару ў справе паляпшэньня снабжэньня рабочых і далейшага ўмацаваньня змычкі гораду і вёскі. Тут мы павінны даць рашучы адпор, як «лявацкім» недаацэнкам значэньня калгаснага гандлю, так і спробам правэапартуністычных, а таксама кулацкіх элемэнтаў разьвязаць рынчную стыхію, даць волю кулаку, спэкулянту, рвачу. Мы павінны зараз на-бальшавіцку ўзяцца за арганізацыю калгаснага гандлю, вядучы рашучую барацьбу са спэкулянтам і мараздёрам, якія прабуюць нажыцца за кошт калгасьніка і рабочага, штучна ўздуваюць цэны на прадукты.

Паляпшэньне работы каапэрацыі і дзяржгандлю побач з калгасным гандлем пры штодзённай увазе з боку партыйных, савецкіх і прафсаюзных арганізацый забясьпечыць зьніжэньне недахопаў у справе снабжэньня.

Спынюся на асобных канкрэтных прыкладах. Возьмем пытаньне са снабжэньнем рабочых бульбай і гародзінай.

Маскоўская вобласьць дабілася за апошнія два гады падваеньня прадукцыі бульбы, так што далі раней галоўную масу патрэбнай бульбы ўвозілі з іншых абласьцей, то ў даны момант мы можам абыйсьціся амаль бяз усякага ўвозу. Толькі на вінакурную і крухмальна-патачную прамысловасьць мы павінны ўвезьці тысяч дзьвесьці тон, ды і тое 100 з лішнім тыс. тон мы дамо з абласной бульбы. Мы павінны загатовіць для забесьпячэньня Масквы і вобласьці 778 тыс. тон бульбы, — гэта будзе, прыкладна, каля 45 млн. пуд. 45 млн. пуд. бульбы мы павінны загатовіць за кастрычнік і пачатак лістапада, інакш будзе позна, пойдуць хлюпата і маразы. За адзін месяц мы павінны скончыць капаньне бульбы, у асноўным загатовіць яе і завезьці. Уборка бульбы ідзе ня дрэнна, хаця з ураджаем справа стаіць няважна. Ураджай у гэтым годзе меншы, чым у мінулым годзе, бо стаяла засуха. Праўда, ураджай у радзе месц перапамяшаецца для таго, каб менш загатаўляць, але факт той, што ўраджайнасьць бульбы ў гэтым годзе паніжаная. Тым больш трэба ўбраць бульбу поўнасьцю, трэба даставіць у Маскву і ў прамысловыя раёны ў цэласьці і ўсю яе захаваць. У адной Маскве мы павінны захаваць звыш 400 тыс тон бульбы.

Справу хаваньня бульбы мы павінны значна палепшыць, бо да гэтай справы ў нас часта адносіцца вельмі нядбайна і ў рэзультаце шмат бульбы прападае. З гэтай мэтай арганізацыю хаваньня бульбы трэба ўсклясьці на спэцыяльных адказных людзей, высоўваючы на гэту справу і сакратароў ячэек і работнікаў гарадзкіх і абласных устаноў і г. д.

Але асаблівую ўвагу трэба адаць таму, каб бульба ня трапіла ў рукі спэкулянтаў і перакупшчыкаў, а трапіла-б у першую чаргу рабочаму. Гэта асабліва важна зараз з прычыны поўнага неўраджаю бульбы. Між тым часта ў магазынах можна наглядаць, як бульбу скупаюць цэльмі мяшкамі адны і тыя-ж асобы ў мэтах спэкуляцыі. Вось чаму мы паставілі прычыцць энэргічныя меры для барацьбы са спэкулянтамі і перакупшчыкамі бульбы і арганізаваць яе разьмеркаваньне так, каб забясьпечыць у першую чаргу рабочым, а потым і іншаму працоўнаму насельніцтву магчымасьць атрымаць бульбу на працягу ўсёй зімы 1 вясны.

Трэба адкінуць абязьлічку загатовак. Кожны раён Масквы атрымае пэўныя раёны для загатовак бульбы. А прадпрыемствы, такія, як напрыклад, Электразавод, Аўтазавод імя Сталіна, «Шарыкопадшыпнік», атрымаюць пэўную групу калгасаў. Мы будзем ведаць, калі ў Фрунзэўскім раёне або якім-небудзь іншым няма бульбы, гэта значыць дрэнная работа раёну. Калі ёсьць бульба — добрая работа раёну. Гэта будзе ведаць кожны рабочы. Апрача бульбы рабочы павінен быць на зіму забясьпечан квашанай капустай, салёнымі гуркамі, памідорамі, морквай, цыбулай.

Выключна важнае значэньне ўсё больш і больш набывае грамадзкае харчаваньне. Яшчэ ў 1928 г. у Маскве было ўсяго 167 сталовак, а абедаючых 180 тыс., у 1931 г. — 508 сталовак і абедаючых 874 тыс. чалавек, а ў 1932 г. мы маем ужо каля 1.000 сталовак і абедаючых каля 1.600 тыс. чалавек. Прычым, калі гады два назад была адна вядомая сталоўка «Электраправоду» — усе насіліся з гэтай сталоўкай, я-бы назваў гэты час «Электраправодны пэрыяд у грамадзкім харчаваньні» (сьмех), дык цяпер такія сталоўкі налічваюцца па Маскве сотнямі (сталовыя на заводзе імя Сталіна, «Серпе і молоте» і па радзе іншых). Напрыклад, сталовая аўтазаводу імя Сталіна адпускае штодзённа 18.000 абедаў, мае дыэтсталовую на 450 чал., рабочае кафэ, адкрытае з 7 гадз. раніцы да 12 гадз. ночы, ёсьць 50 буфэтаў у цэхах.

За чэрвень, ліпень, жнівень і першую палову верасьня з цэнтралізаваных крыніц мяса атрымана на 20 дзён, у парадку самазагатовак і са сваёй харчбазы яшчэ на 15 дзён. Вялікая ўласная харчбаза: 700 сьвіней, саўгас у Гжацкім раёне, малочная фэрма на 25 кароў, закладваюцца 2 грыбніцы, арганізуецца каўбасная вытворчасьць.

У той-жа самы час ёсьць, зразумела, і сталовыя, дрэнна працуючыя.

Цэлы рад прыкладаў паказвае, што ад ініцыятывы мясцовых арганізацый залежыць вельмі і вельмі многае ў справе барацьбы за паляпшэньне рабочага снабжэньня і грамадзкага харчаваньня.

Мы зараз намячаем павялічыць абсяг грамадзкім харчаваньнем у Маскве да 2 млн. чалавек. Прыдзецца арганізаваць новыя сталоўкі для служачых і яшчэ мінімум 80—100 новых сталовак для рабочых, каб ахапіць вялікую колькасьць людзей. Калі мы паставім грамадзкае харчаваньне залежным чынам, мы можам забясьпечыць рабочага, у асаблівасьці халастога, і сьнеданьнем і абедам, і вячэрай, і кофэ, і чаем у гэтай-жа сталовай.

Спыніўшыся падрабязна на недахопах у загатоўцы, хаваньні і разьмеркаваньні мяса, т. Кагановіч падкрэсьліў, што ад нашага ўменьня арганізаваць загатоўкі і правільнае разьмеркаваньне залежыць нармальнае снабжэньне рабочых Масквы мясам. Тав. Кагановіч падрабязна расказаў аб мерапрыемствах, якія прымаюцца зараз ЦК для поўнага выкананьня пляну мясазагатовак і паляпшэньня снабжэньня.

У асаблівасьці мы павінны рашуча змагацца з раскрадваньнем і разбазарваньнем мяса ў нашай таваратраводзячай сетцы, па стратамі пры перавозцы жывёлы і г. д.

Трэба ня толькі рэзалюцыі пісаць, але і на-бальшавіцку іх выконваць і змагацца, напрыклад за тое, каб кожны кілёграм мяса дайшоў да рабочага. Правільна, мы ў галіне жывёлагадоўлі маем найбольшыя труднасьці, але мы не павінны дазваляць ныцікам і бюракратам прыкрываць спасылкамі на гэтыя агульныя затрудненьні сваё гультайства, дрэнную работу і слабую барацьбу з дрэнным гаспадараньнем, з раскрадваньнем.

Значную ўвагу мы павінны аддаць стараньню і разьвіцьню харчовых баз пры прадпрыемствах, ЗПК, заводзкіх сталовых. Дапаможныя гаспадаркі спажыўкаапэрацыі ўжо зараз займаюць салідное месца ў народнай гаспадарцы. Трэба гэту справу (сьвінагадоўлю, трусагадоўлю, рыбаводзтва і інш.) усямерна разьвіваць і далей.

Мы павінны таксама ўсямерна падтрымліваць самадзейныя дапаможныя гаспадаркі рабочых — разьвядзеньне рабочымі сем'ямі кур, трусоў, сьвінак, коз, кароў, агародаў, пчол; у асаблівасьці гэта адносіцца да прадпрыемстваў у вобласьці.

Зьнішчыць недахопы, арганізаваць новыя перамогі ў чорнай мэталюргіі

Даўшы падрабязны аналіз сацыяльна-эканамічных зрухаў у нашай краіне ў сувязі з посьпехамі і перамогамі пяцігодкі, ілюструючы лічбамі пасьпяховае выкананьне пяцігодкі па буйнейшых галінах гаспадаркі (машынабудаўніцтва, нафта, электратэхніка, швэйная і г. д.), тав. Кагановіч асабліва падкрэсьліў, што адстаючымі ў выкананьні праграмы гэтага году галінамі аказаліся чорная мэталюргія і рад галін лёгкай індустрыі.

Іменна таму невыпадкова, што пленум ЦК сканцэнтраваў увагу ўсёй партыі і рабочай класы на пытаньнях чорнай мэталюргіі і выбару прадметаў шырокага спажываньня. Гэтыя пытаньні разам з пытаньнем аб далейшым разгортваньні савецкага гандлю ўяўляюць сабой у сучасны момант тыя зьвеньні, за якія неабходна ўхапіцца для таго, каб дабіцца далейшага ўздыму матар'яльнага дабрабыту працоўных гораду і вёскі і далейшага ўмацаваньня змычкі рабочай класы з сялянствам.

Ня гледзячы на тое, што чорная мэталюргія належыць да галін, адстаючых у выкананьні праграмы гэтага году, мы маем у гэтай галіне буйнейшыя дасягненьні, якія мы ні ў якім выпадку ня можам недаацэньваць. Тэмпы і размах, якімі ідзе разьвіцьцё нашай чорнай мэталюргіі, зьяўляюцца нябывалымі і нямысьлімымі для капіталістычных краін. Гэтыя посьпехі нашай чорнай мэталюргіі выглядаюць асабліва вялікімі на фоне таго развалу, які мы назіраем у чорнай мэталюргіі, як і ва ўсіх галінах гаспадаркі капіталістычных краін у сувязі з крызісам. У той час, як усе капіталістычныя краіны вымушаны гасіць домну за домнай і рэзка скарачаць выплаўку чыгуну і сталі, мы ўводзім у строй усё новыя і новыя домны і рэзка павялічваем выплаўку. Даволі сказаць, што за адзін толькі пэрыяд пасьля XVI зьезду партыі мы перабудавалі 8 доменных печаў, пусьцілі 12 новых доменных печаў, прычым у адным толькі 1932 годзе мы пусьцілі 9 печаў. У бліжэйшыя дні ў строй увойдуць яшчэ 2 новыя доменныя печы. З 20 пушчаных за апошні час новых мартэнаў 13 прыходзіцца на 1932 год. Апрача таго, у будоўлі знаходзіцца 16 домнаў і 50 мартэнаў. Што датычыць выплаўкі, то па чыгуну яна складала за 9 месяцаў 4½ млн. тон, па сталі — 4,1 млн. тон, а па пракаце — 3½ млн. тон. Павялічыўся ў нас выраб якасных сталяй.

Аднак усе гэтыя нашы дасягненьні ў чорнай мэталюргіі ні ў якім выпадку не павінны закрываць ад нас тых вельмі істотных недахопаў, якія мы маем як у частцы будаўніцтва і ўводу ў эксплёатацыю новых домнаў, мартэнаў і пэкатных варштатаў, так і асабліва ў частцы выкананьня прадпрыемствамі чорнай мэталюргіі пляну выплаўкі і пракату. Пры гэтым мы павінны выходзіць з гіганцкіх ўзросшых патрэб нашай народнай гаспадаркі ў мэталі і з тых магчымасьцяй, якія мы маем для значнага павялічэньня выпуску мэталю, але якія мы ў далёка невыстарчальнай меры выкарыстоўваем. Буйнейшы попыт на мэталь прад'яўляе ў першую чаргу наша падзвычай узросшае машынабудаўніцтва, запатрабаваньні якога мы, на жаль, задавальняем у вельмі нязначнай ступені. Тут мы маем сур'ёзнейшую дыспрапорцыю паміж ростам машынабудаўніцтва і задаваленьнем яго мэталем. Так, напрыклад, калі машынабудаўніцтва ў нас вырасла ў адносінах да 1928 г. у 4 разы, то выплаўка сталі ў нас вырасла ўсяго на 36 проц. Адсюль ясна, якое значэньне для нас набывае работа чорнай мэталюргіі, выяўленьне і зьнішчэньне тых недахопаў, якія мы маем у справе арганізацыі і кіраўніцтва работай прадпрыемстваў чорнай мэталюргіі. А недахопаў гэтых, як гэта паказалі даклады на пленуме, на жаль, вельмі многа. Гэта адносіцца і да Маскоўскай вобласьці, дзе мы маем такія прадпрыемствы, як Тульскі мэталюргічны завод, завод «Серп і молат» у Маскве, «Электрасталь», а таксама будаўніцтва новага мэталюргічнага заводу ў Туле, работу якіх мы павінны былі-б зрабіць чорнай. Значнае адставаньне мэталюргічных прадпрыемстваў у выкананьні пляну адносіцца таксама і да нашых прадпрыемстваў, дзе план за 8 месяцаў выканан усяго толькі на 80 проц., хаця прадукцыя гэтых заводаў дала прырост у адносінах да мінулага году на 24,5 проц. І мы, масквічы, павінны дабіцца хутчэйшага выпраўленьня недахопаў у нашай чорнай мэталюргіі, а таксама асабліва ў рабоце Падмаскоўнага басэйну.

У сваёй рэзалюцыі пленум ЦК падкрэсьліў, што галоўнейшай з усіх існуючых прычын зусім нездавальняючай работы чорнай мэталюргіі зьяўляецца іменна нездавальняючае гаспадарчае і адміністрацыйна-тэхнічнае кіраўніцтва яе работай, а таксама слабая ўвага да вывучэньня і аўладаньня тэхнікай ў вытворчасьці, нізкая працацыцыпліна і слабая ўвага да штодзённых бытавых патрэб рабочых.

Прыводзячы рад прыкладаў з жыцьця і работы прадпрыемстваў, т. Кагановіч гаворыць:

— На гэтых прыкладах мы бачым, як глыбока меў рацыю ў сваіх выступленьнях тав. Сталін, падкрэсьліваючы вялізарнае значэньне ў сучасны момант рывучэньня тэхнікі, правільнага і канкрэтнага кіраўніцтва для поўнага выкананьня нашай прамысловасьцю, асабліва чорнай мэталюргіяй, намечаных для яе плянаў.

У ліку прычын нездавальняючай работы чорнай мэталюргіі буйнейшае месца займае слабая работа па падрыхтоўцы кадраў, пачынаючы ад рабочых, майстраў і тэхнікаў, і канчаючы інжынэрамі і кіраўнікамі цэхаў і прадпрыемстваў. Гэта пытаньне вострае ня толькі для чорнай мэталюргіі. Мы маем на нашых прадпрыемствах вялізную колькасьць новых рабочых і маладых майстраў, тэхнікаў і інжынэраў. Даволі, напрыклад, сказаць, што за адзін толькі пэрыяд пасьля XVI зьезду партыі мы перабудавалі 8 доменных печаў, пусьцілі 12 новых доменных печаў, прычым у адным толькі 1932 годзе мы пусьцілі 9 печаў. У бліжэйшыя дні ў строй увойдуць яшчэ 2 новыя доменныя печы. З 20 пушчаных за апошні час новых мартэнаў 13 прыходзіцца на 1932 год. Апрача таго, у будоўлі знаходзіцца 16 домнаў і 50 мартэнаў. Што датычыць выплаўкі, то па чыгуну яна складала за 9 месяцаў 4½ млн. тон, па сталі — 4,1 млн. тон, а па пракаце — 3½ млн. тон. Павялічыўся ў нас выраб якасных сталяй.

Аднак усе гэтыя нашы дасягненьні ў чорнай мэталюргіі ні ў якім выпадку не павінны закрываць ад нас тых вельмі істотных недахопаў, якія мы маем як у частцы будаўніцтва і ўводу ў эксплёатацыю новых домнаў, мартэнаў і пэкатных варштатаў, так і асабліва ў частцы выкананьня прадпрыемствамі чорнай мэталюргіі пляну выплаўкі і пракату. Пры гэтым мы павінны выходзіць з гіганцкіх ўзросшых патрэб нашай народнай гаспадаркі ў мэталі і з тых магчымасьцяй, якія мы маем для значнага павялічэньня выпуску мэталю, але якія мы ў далёка невыстарчальнай меры выкарыстоўваем. Буйнейшы попыт на мэталь прад'яўляе ў першую чаргу наша падзвычай узросшае машынабудаўніцтва, запатрабаваньні якога мы, на жаль, задавальняем у вельмі нязначнай ступені. Тут мы маем сур'ёзнейшую дыспрапорцыю паміж ростам машынабудаўніцтва і задавален

Аб выніках верасьнёўскага пленуму ЦК і задачах маскоўскай арганізацыі

З дакладу тав. КАГАНОВІЧА на пленуме МК і МГК сумесна з сакратарамі райкомаў вобласьці і актывам Маскоўскай арганізацыі УсеКП(б) 8 кастрычніка 1932 г.

падарчай прадукцыі. Таму неабходна нам— работнікам Маскоўскай вобласьці — узяцца шчыльна за ажыцьцяўленьне гэтых пастаноў, усяморна ўмацоўваць пашы калгасы і ўзьнімаць ураджайнасьць нашай сельскай гаспадаркі. Гэта патрабуе ад нас дакладнага, канкрэтнага вывучэньня асаблівасьцяй нашай сельскай гаспадаркі, асаблівасьцяй кожнага калгасу і раёну, вывучэньня аграпаміі і тэхніку сельска-гаспадарчай вытворчасьці. Недарма ЦК, надаючы гэтай справе выключнае значэньне, вынес пастанову аб рэарганізацыі ўсіх камвузаў у вышэйшыя сельска-гаспадарчыя камуністычныя школы і паставіў перад імі задачу вывучаць ня толькі партыйнае і савецкае будаўніцтва ў вёсцы, але і аграпамію, эстэтэхніку, расьлінаводзтва і г. д. Побач з гэтым мы павінны навучыць і настойліва праводзіць у жыцьцё канкрэтную праграму стварэньня для кожнага прадпрыемства ўласнай харчовай базы, аб чым я ўжо падрабязна гаварыў.

Выключнае гістарычнае значэньне для замацаваньня нашых заваяваньняў у галіне сацыялістычнага будаўніцтва мае дэкрэт аб ахове і ўмацаваньні сацыялістычнай уласнасьці.

Барацьба за ахову сацыялістычнай уласнасьці супроць кулака, спэкулянта, злодзея, жуліка і гужаеда зьяўляецца ў цяперашні час адной з важнейшых форм клясавай барацьбы. Клясавая барацьба не аслаблена, яна набывае іншыя формы, разгромленае, але яшчэ недабітае намі кулацтва, адчуваючы, што нашы дасягненьні канчатковага яго дабіваюць, робіць распачлівыя спробы да падрыву перамогнага калгаснага ладу ў вёсцы, да раскрадваньня грамадзкай і дзяржаўнай маемасьці і г. д. Вось чаму, усямерна разгорваючы савецкі, у прыватнасьці калгасны гандаль, умацоўваючы праз яго саюз рабочай клясы і калгаснага сялянства і выкараняючы прыватніка і спэкулянта, мы не павінны аслабіць нашай барацьбы з кулацтвам і яго агентурай.

Спробам кулака і яго агентаў, у якую-бы адзежу яны ні апраналіся, мы будзем даваць самы бязьлітасны адпор. Разьбіваючы ворагаў, мы мабілізуем свае невычарпальныя сілы, цясьней згуртоўваемся вакол свайго ленінскага ЦК і змагаемся за ажыцьцяўленьне яго пастаноў, за ўмацаваньне і паляпшэньне работы калгасаў, за ўздым ураджайнасьці сельскай гаспадаркі, за вырашэньне жывёлагадоўчай праблемы, за паваньне савецкага гандлю і за паляпшэньне снабжэньня рабочых. Гэта ёсьць наша бальшавіцкая праграма, супроць якой вядуць з лягеру правых і «левых» апартуністаў. Мы, бальшавікі, вырашыўшы задачы выключнай вялічыні і труднасьці, стварыўшы базу цяжкай індустрыі, стварыўшы калгасы і саўгасы і вырашыўшы рад іншых буйнейшых задач, вырашым і гэтыя задачы, пастаўленыя пленумам ЦК, і павядзем нашу краіну, рабочую клясу і калгаснае сялянства да новых перамог. Калі зараз у нашым асяродзьдзі сустракаюцца людзі, якія войкаюць і ахкаюць з поваду затрудненьняў, якія сустракаюцца, то мы гаворым ім: ніцыянэр, які перазумее таго, што бяз трудасьцяй ня можа абыйсьціся тая вялізарная перабудова нашай краіны, якую мы правялі па ператварэньні нашай адсталай, бездарожнай, пякультурнай, паўдзікай краіны і асабліва перабудова цёмнай, забітай вёскі, якая вякамі прыгнечвалася,— у перадавую прамысловую і культурную краіну, у краіну самага буйнага ў сьвеце зямляробства, перабудова, якая праводзіцца ня гледзячы на шалёнае супраціўленьне зьнішчаемага клясавага ворага і яго шматлікай агентуры. Нічога ня варты той бальшавік, які не бачыць вялізарных зьмен, што адбыліся ў нашай краіне.

Даволі прывесьці толькі адно параўнаньне.

У 1921 годзе Ленін пісаў:

«Паглядзеце на карту РСФСР. На поўнач ад Волагды, на паўднёвы ўсход ад Растова-на-Доне і ад Саратава, на поўдзень ад Арэнбурга і ад Омску, на поўнач ад Омску ідуць неабсяжныя прасторы, на якіх зьмясьціліся-б дзесяткі вялізарных культурных дзяржаў. І на ўсіх гэтых прасторах пануе патрыярхальшчына, паўдзікасьць і самая сапраўдная дзікасьць. А ў сялянскіх закутках усёй астатняй Расіі? Усюды, дзе дзесяткі вёрст прасёлку — правільней, дзесяткі вёрст бездарожжа — аддзяляюць вёску ад чыгунак, г. зн. ад матар'яльнай сувязі з культурай, з капіталізмам, з буйнай прамысловасьцю, з вялікім горадам? Няўжо не пераважнае ўсюды ў гэтых месцах таксама патрыярхальшчына, абломаўшчына, паўдзікасьць?» (Ленін, т. XVIII, ч. 1, стар. 204).

А зірніце вы цяпер — у 1932 годзе на карту Савецкага саюзу. Якія вялізарныя зьмены ўнесла пяцігодка. Сотні новых прамысловых прадпрыемстваў, дзесяткі новых гарадоў (Хібінскія апатыты і Хібінагорск, Кандалакша, Ігарка, заводы паўночнага Ўралу — Бярэзьлякі, Салікамск, Магнітагорск-Караганда, Кузбас, Турксіб, Днепрабуд і г. д. і г. д.).

А па дзесятках тысяч кілёмэтраў вясковага бездарожжа, дзе яшчэ нядаўна панавалі дзікасьць, патрыярхальшчына, вырасьлі сотні і тысячы новых саўгасаў, калгасаў, МТС, школ, клюбаў, бібліятэк, 140 тыс. трактараў баразьняць палі калгасаў і саўгасаў, дзесяткі тысяч аўтамабіляў свайго вырабу рушацца па новых тысячах кілёмэтраў новых шасэйных дарог.

І ў гэты час знаходзяцца людзі з контррэвалюцыйнага трацкісцкага і праваўхілісцкага лягеру, якія зараз — у 1932 годзе прапануюць нам ня больш ня менш, як здаць пабудаваныя ўпартай працай рабочае клясы і калгасьнікаў заводы на канцэсіі капіталістам. Знаходзяцца людзі, якія прапануюць нам ня больш ня менш, як распусьціць калгасы і саўгасы і аддаць кулака. Мы дабіліся рашаючых посьпехаў у барацьбе за эканамічную незалежнасьць на нашай краіны, у барацьбе за яе індустрыялізацыю. А зараз знаходзяцца людзі, якія прапануюць нам узмацніць нашу залежнасьць ад капіталістычнага сьвету, бо з нашай барацьбы за эканамічную незалежнасьць, усё-роўна, моў, нічога ня выйдзе. І ўсё гэта ня выдуманыя суб'екты, а канкрэтныя жывыя людзі, якія да апошніх дзён захоўвалі ў сябе партыйны білет. Я маю на ўвазе людзей, якія належалі раней да трацкісцкай, або праваапартуністычнай апазыцыі. Сярод прыхільнікаў гэтых былых апазыцый ёсьць дзьве катэгорыі людзей: адна з іх сумленна парвала са сваім мінулым і імкнецца шчыра весьці актыўную барацьбу за лінію нашай партыі. Другая катэгорыя вярнулася ў нашу партыю з тым, каб адсядзецца да «лепшых» часоў, прынесла камень за пазухай і карыстаецца малейшай магчымасьцю для таго, каб подла і здрадніцкі аднаніць барацьбу супроць партыі, барацьбу, набыўшую яўна контр-рэвалюцыйны характар. Гэтыя паны прапаведуюць простую рэстаўрацыю капіталізму. Гэта мізэрная група, прагніўшыя асколкі трацкісцкай і праваўхілісцкай апазыцыі, з якой ня трэба ўступаць у спрэчкі, а проста вышвырнуць вон з радоў нашай ленінскай партыі, выганяць тых, хто прымірэнцтвуе да гэтых ворагаў, укрывае іх і дапамагае ім.

А вялікая ленінская партыя пойдзе цьвёрда сваім баявым шляхам і яшчэ цясьней згуртуецца вакол свайго ЦК, вакол свайго стойкага правадыра, кіраўніка і настаўніка тав. Сталіна. (Бурныя воплескі).

Мы ні на хвіліну не забываем, што іменна, дзякуючы цьвёрдаму ленінскаму кіраўніцтву ЦК і тав. Сталіна, наша краіна гіганцкі ўмацавала ня толькі сваю ўнутраную, але і міжнародную магутнасьць. На базе індустрыялізацыі мы ўмацавалі абароназдольнасьць нашай краіны і магутнасьць Чырвонай арміі — гэта дае нам магчымасьць весьці вытрыманую і вартую пралетарскай дзяржавы міжнародную палітыку. Наш рабочы і калгасьнік цьвёрда ўпэўнены, што іх урад, вядучы палітыку мору, у выпадку патрэбы зможа пастаяць за сябе і адстаяць незалежнасьць нашай вялікай краіны ня толькі словам, але і справай і ня толькі за дыплёматычным сталом.

Вось чаму наш рабочы і калгасьнік самаадданна падтрымліваюць савецкую ўладу, нашу партыю і яе верную ленінскую палітыку.

Маскоўская арганізацыя бальшавікоў, даваўшая ня раз узоры непрымірымай барацьбы супроць скрытых і адкрытых ворагаў партыі і яе ЦК, зараз, як ніколі згуртавана вакол свайго ЦК і гатова біцца да канца за яго лінію, за яго пастановы, за поўную перамогу сацыялізму. (Бурныя аплёдысмэнты).

Голасам усіх маскоўскіх бальшавікоў мы гаворым: няхай жыве наш ленінскі ЦК!

Няхай жыве наш настаўнік і кіраўнік, наш правадыр тав. Сталін! (Бурныя аплёдысмэнты).

ПАДВОІМ ТЭМПЫ ЗБОЖЖАЗАГАТОВАК!

Вышэй узьняць клясавую пільнасьць!

(Агляд лістоў)

Збожжазагатоўкі разгортваюцца ва ўмовах жорсткай клясавай барацьбы. Кулацтва ўсімі спосабамі і сродкамі імкнецца сарваць важнейшае мерапрыемства партыі і ўраду, яно ня толькі сабатуе адчуваючы цьвёрдых заданьняў, але імкнецца ўплываць на адсталую частку калгасьнікаў, распаўсюджвае дробна-буржуазныя, рваныя тэндэнцыі, праз сваю агентуру ў паасобных зьвеньнях нізавога апарату затармозіць, перашкодзіць ходу загатовак збожжа. Кулацтву ў гэтым дапамагаюць правыя і «левыя» апартуністы, якія скажаюць лінію партыі ў збожжазагатоўках.

Мабілізацыя калгасных і бяднацка-серадняцкіх мас на рашучы адпор кулаку і яго агентуры, разгортваньне шырокай растлумачальнай работы набываюць зараз актуальнае значэньне.

У лістох карэспандэнтаў і рабселькораў можна сустрэць рад фактаў, якія сьвядчаць аб кулацкіх маёўрах, накіраваных на зрыў загатовак. У гэтых карэспандэнцыях выкрываецца роля кулацкіх агентаў на загатоўчым фронце.

Вось што піша напрыклад, нам тав. **АНУШЭВІЧ** з Рэпшацкага раёну.

«Члены сельсавету в. Углы, Жарскага сельсавету, Стручонак і Капаленка, замест дапамогі сельсавету ў правядзеньні загатовак, спрыяюць кулаку зрываць кампанію. 23 верасьня, калі было даручана склікаць сход (у другі раз), яны з мэтай зрыву сходу паведамілі толькі заможнай частцы вёсні. Пераважная частка беднаты і сераднякоў ня ведалі, што будзе сход, бо гэтыя кулацкія прахводы ім не паведамілі. У выніку сход і ў другі раз сарваўся».

У Чарнянскім сельсавеце, Шкловскага раёну, як паведамляюць **Я. і Є. Прымежныя**, члены сельсавету **Грэк і Конанаў**

« Замест мабілізацыі мас на выкананьне плянаў, хадзілі па хатах і займаліся хныканьнем і разважаньнямі аб нерэальнасьці заданьняў, занёўляючы аб неабходнасьці зьмяншэньня норм».

Права- апартуністычныя разважаньні аб нерэальнасьці плянаў, разьбітыя самім жыцьцём, якое па-вопыце пераадавых рэчэнаў і сельсаветаў даказала поўную магчымасьць датэрміновага выкананьня плянаў, павінны сустрэць самы рашучы, самы бязьлітасны адпор.

Тав. **Пятро Бядулін** з Чырвонапольскага раёну ў сваім лісьце ілюструе шкодніцкую дзейнасьць старшыні Кажамякінскага сельсавету **Петрашэнкі**, які

«У адказны момант правядзеньня гаспадарча-палітычных кампаній замяўся п'яны кай з кулакамі, растраціў дзяржаўныя грошы, абкладаў цьвёрдым заданьнем бедняко ў і сераднякоў, а цяпер адпачывае дома. Плян загатовак збожжа па гэтым сельсавеце выкананы толькі на 4 проц.».

Тав. **М. Піскун** паведамляе з Старобінскага раёну, што на чале калгасу **«Свабода»** стаіць кулацкі агент **Старосьцін**, які вядзе калгас да развалу, разбазарвае памольны збор і разьмяркоўвае жыта па кулацкім прынцыпе.

Задача дня — узмацніць клясавую пільнасьць у адносінах да малейшых праяўленьняў апартунізму, у адносінах да скрыўленьняў лініі партыі, бязьлітасна выкрываць і гнаць з савецкага і загатоўчага апарату кулацкіх агентаў, якія выконваюць заказ клясавага ворага. Трэба мабілізаваць усе сілы, каб забясьпечыць рашаючую перамогу на збожжазагатоўчым фронце.

Расьце лік пераможцаў

Калгасы Бораўскага сельсавету, Менскага раёну, «Зара захаду», «7 самарская», імя Н-скага корпусу, «VI зьезд саветаў» выканалі гадавы плян загатовак на 102 проц. Замест 108 цэнтн. здана 110.

Гэтыя посьпехі дасягнуты дзякуючы своячасоваму абмалоту, мабілізацыі калгасных мас, масавага растлумачальнай работы вакол пастаноў партыі і ўраду аб збожжазагатоўках і калгасным танцы, дзякуючы разгортваньню сацыябарніцтва паміж калгасамі.

РЫЖАНКОЎ.

БРАГІН. (Наш кар.). На 5 кастрычніка па раёну паступіла 346 тон збожжа, што складае 36 проц. гадавога пляну. Ад калгасаў паступіла 63 проц., ад бяднацка-серадняцкіх гаспадарак—15 проц., па цьвёрдых заданьнях — 12 проц.

Ёсьць калгасы, якія могуць быць прыкладам для іншых. Яны павінны быць уключаны ў гэтрэны сьпіс калгасаў, якія да тэрміну здалі збожжа. Вось яны: імя Варашылава, «Чырвоная гаспадарка», «Надзеч», «Цалуйка», «Інтэрнацыянал», «Сьпярыжка», імя Чакалова, «Днепровец».

М. ШАЙКЕВІЧ.

Меншчына павінна заваяваць перадавыя пазыцыі

На 10 кастрычніка Менскі раён выканаў гадавы плян збожжазагатовак на 60,7 проц. Калгасы выканалі свой плян на 78 проц., аднаасобнікі на 31 проц. Па цьвёрдых заданьнях здана 25 проц.

Паасобныя сельсаветы ўжо набліжаюцца да поўнага выкананьня гадавых заданьняў. Напрыклад, **прыгарадны сельсавет поўнасьцю выканаў свой плян**, Грычанскі — на 79 проц., Крупіцкі — на 78 проц., Ратамскі — на 74 проц., Самахвалавіцкі — на 65 проц. У Самахвалавіцкім сельсавеце партыйчэйка і сельсавет мабілізавалі на правядзеньне масавай работы ўвесь актыў у вёсках і населішчах. Увесь апарат сельсавету знаходзіцца на вучастках. Калгасы сельсавету выканалі свой плян на 92 проц. Вёскі: Валіцкоўшчына, Стукачыцы і Цімошкі, дзе аднаасобны сэктар складае каля 50 проц., ужо здалі 90 проц. пляну. У вёсцы **Валіцкоўшчына аднаасобнікі арганізавалі калектыўны абмалот збожжа і поўнасьцю выканалі свае самазабавязацельствы.** Сельсаветам, аддзелам нац. суд і аштрафаваны рад цьвёрдазаданьнікаў, якія ўхіляліся ад здачы збожжа.

Побач з гэтым трэба канстатаваць адсталыя тэмпы некаторых сельсаветаў Меншчыны, якія ўвесь час плятуцца ў хвасьце. Прыкладам могуць служыць **Апчанскі** сельсавет, які здаў 37 проц. і Калодзішчанскі, — 49 проц. Адной з прычын гэтага адставаньня зьяўляецца тое, што партыйчэйкі на мясцох і сельсаветы ніякай работы па арганізацыі збожжазагатовак не вядуць, камісіі саўдзельнасьці не працуюць. Зусім дрэнна ў гэтых сельсаветах стаіць справа са спаганяньнем цьвёрдых заданьняў. Кулацка-заможныя гаспадаркі сабатуюць здачу збожжа і разбазарваюць яго на месцах. На Апчанскім толькі 1 цэнтн. з 23. Кулацка-заможныя гаспадаркі в. Забалоцьце ня выконваюць цьвёрдых заданьняў, а вязуць збожжа для продажу на рынак. Сельсавет на чале з тав. **Халадзінскім** ніякай барацьбы з гэтым не вядзе.

У в. Вернае Сіняла, Караліфчанскага сельсавету, цьвёрдазаданьнік Язэп Варэнік ня здаў ні аднаго кілёграму і захаваў 16 пуд. жыта. Цьвёрдазаданьнік Альшэўскі Філіп, Каралёва-Станаўскай вёскі, Калодзішчанскага сельсавету, адкрыта выступе супроць збожжазагатовак, з данага яму цьвёрдага заданьня 30 пуд. на здаў ні аднаго фунту, а сельсавет глядзіць па гэта скрозь пальцы.

Вельмі адсталы вучастак — памольны збор. За апошні час па радзе сельсаветаў пакапілася дзесяткі тон збожжа. На млыне «Весьніцка» ляжыць 5 тон збожжа, на млыне «Бан» (Самахвалавічы) — 6 тон, «Прылукі» — 3 тоны, «Банцарава» — 3 тоны і інш. Кіраўнікі млынаў тлумачаць гэта адсутнасьцю транспарту, на справе-ж яны проста разбазарваюць памольны збор. Менская міжраённая кантора «Загатзбожжа», якая аб'яднае Чэрвеньскі, Пухавіцкі і Смалявіцкі раёны, ня цікавіцца ходам загатовак па гэтых раёнах.

— Мы адкрылі там свае склады, а далей ужо ня наша справа, — гаворыць нам. упаўнаважанага тав. **Зевін.**

Гэтымі днямі выяжджае на раён 50 чал. мабілізаваных гарсаветам. Таксама выяжджаюць у сельсаветы ўвесь прэзыдыум гарсавету і апарат канторы «Загатзбожжа».

Менскі раён, які ня раз паказваў узоры бальшавіцкай барацьбы за выкананьне народна-гаспадарчых пляноў, павінен выйсьці пераможам і на фронце збожжазагатовак.

Т. І.

Ударныя брыгады на збожжазагатоўках

ЧЫРВОНАЯ СЛАБАДА. (БЕЛТА). На 7 кастрычніка гадавы плян збожжазагатовак выканан па раёну на 57,2 проц. Асабліва дапамог у гэтым конкурс на лепшага збожжа-здатчыка — калгас і кантрактанта, які быў абвешчан раённымі арганізацыямі. Раённая конкурсная камісія апрацыйка кіруе конкурсам: вядзе стаўлі вучот здатчыкаў-кантрактантаў, вызначае прэміі, выносіць ударныя кнігі пасьпяхова выканаўшым свае самаабавязацельствы перад дзяржавай.

Ва ўсіх сельсаветах раёну праведзены зьлёты ўдарнікаў — здатчыкаў збожжа — кантрактантаў-адказасобнікаў і калгасьнікаў.

У кожным населішчы і дзесяцідворцы арганізаваны ўдарныя брыгады на дапамогу выкананьню пляну па збожжазагатоўках.

Па Смаліцкім сельсавеце член сельсавету **ЛЕБЕДЗЬ ПЁТРА** арганізаваў у населішчы Воўна ўдарную брыгаду з лепшых здатчыкаў — **Рамакенкі Я., Пяднеўіча Я., Мялешкі М., Падневіча Х. і Чарткевіча Дакілы.** У выніку работы брыгады на гэтым вучастку гадавы плян выкананы на 100 проц.

Такую-ж ударную работу правёў на сваім вучастку член сельсавету **МІХАЛКОВІЧ ТАМАШ.** Ён таксама арганізаваў брыгаду з лепшых здатчыкаў — аднаасобнікаў — **Кандрацені Хведара, Кандрацені Міхалая і Сергеенкі Рамана,** якія дабіліся выкананьня пляну на сваім вучастку на 95 проц.

Дзякуючы дастасаваньню сацыялістычных мэтадаў работы, гадавы плян збожжазагатовак па Смаліцкаму сельсавету ўжо выкананы на 90 проц. Такімі-ж мэтадамі праводзіць загатоўкі Чапліцкі сельсавет, выканаўшы плян на 74,2 проц.

Чырвона-Слабадзкі раён бярэ на сябе абавязак да дня 15 гадавіны Кастрычніцкай рэвалюцыі рапартаваць партыі і ўраду аб поўным выкананьні гадавога заданьня.

Справу аб Паўлючэнку расьсьледуе... Паўлючэнка

У **Клімавіцкім** раёне рэагаваньне на допісы рабселькораў, а таксама лісты рабочых і калгасьнікаў пастаўлена далёка нездаволіваюча. Возьмем для прыкладу Клімавіцкі **райкалгассаюз.**

Карэспандэнцыі расьсьлеўваюцца вельмі марудна. Допіс, у якім селькор сыгналізаваў аб бязьдзейнасьці праўленьня калгасу «XII-годзьдзе Кастрычніка» па падрыхтоўцы да сяўбы, і рад іншых допісаў, накіраваных газэтамі «Калгасьнік Беларусі» і «Камунай» для рэагаваньня ў Клімавіцкі райкалгассаюз яшчэ ў студзені месяцы бягучага году, патанулі ў бюракратычных справах гэтай установы.

Значная частка заметак перадаецца райкалгасаюзам «для расьсьледваньня і прыняцьця мер» у **МТС.** Гэта робіцца для таго, каб пазбавіцца дасланых на расьсьледваньне допісаў і лістоў. Як адносіцца ў МТС да расьсьледваньня і рэагаваньня на гэтыя допісы і лісты відаць з наступнага прыкладу. Ліст селькора аб тым, што кіруючы работнік калгасу «Чырвоная зьмена»—Паўлючэнка зрывае мэліярацыйныя работы ў калгасе, аддаецца работнікамі МТС для расьсьледваньня... таму-ж Паўлючэнку. Ясна, што сыгналы, узьнятыя ў лісьце, заглохлі.

Устаноўлена, што пераважная большасьць заметак і лістоў, накіраваных з райкалгассаюзу ў МТС, згублены. Старшыня райкалгассаюзу тав. **Глушакоў**, які ўжо раз атрымаў вымову за нерэагаваньне на допісы ў друку, і зараз яшчэ бюракратычна, па-чыноўніцку адносіцца да лістоў рабочых і калгасьнікаў, да сыгналаў друку. Сакратар **райкалгасу** тав. **Грамчажка** лічыць, што ў РК ЛКСМБ у гэтым напрамку ўсё стаіць добра. «Мы,—кажа ён,—на заметкі рэагавалі, толькі бяда, што няма ў нас уліку гэтай работы»:

На справе-ж гэта ня так. Рад заметак засталіся без рэагаваньня і расьсьледваньня. Былі выпадкі, калі «рэагаваньне» і вывады рабіліся пасьля асабістых гутарак работнікаў РК ЛКСМБ з... «пакрыўджанымі» крытыкай.

У **райвыканкаме** з фармальнага боку справа пастаўлена, як быццам-бы здавальняюча. Ёсьць кніга рэгістрацыі атрыманых з рэдакцый допісаў і лістоў, ёсьць папкі і выразкі заметак. Між тым, расьсьледваньне па некаторых заметках цягнецца звыш 4-5 месяцаў. Так, ліст чырвонаармейца Дзьмітрыева аб няправільным абкладаньні яго бацькоў цьвёрдым заданьнем яшчэ са студзеня 1932 году ляжыць у РВК без вырашэньня.

Ня лепшыя адносіны да рабселькораўскіх допісаў і лістоў і ў Клімавіцкім гарсавеце. Старшыня гарсавету т. **Палякоў** не палічыў патрэбным азнаёміць брыгаду, якая правярала справу рэагаваньня, з пастановай яе ў гарсавеце.

Работнікам **райвыканкаму** патрэбавалася 11 дзён для таго, каб перадаць свайму-ж работніку Міронаву заметку, атрыманую райсьпажыўсаюзам для расьсьледваньня. Гэта заметка («Аздаравіць працу сельпо») знаходзілася на расьсьледваньні ў Міронава 43 дні.

Аналёгічныя адносіны да гэтай справы маюць месца з боку загадчыка **райАНА Смалякова**, які «ўсе заметкі разаслаў сакратарам пізавых ячэек», а таксама з боку работнікаў **раймініцыі.** Допіс аб расьсьледваньні селькора з калгасу імя Літвінава ўжо паўтары месяцы знаходзіцца ў міліцыі без належных вынікаў.

Некалькі дадатных фактаў рэагаваньня ёсьць у **Гусарскім** і **Радзінскім** сельсаветах. Партыйная ячэйка і кіруючыя работнікі гэтых сельсаветаў своячасова рэагуюць на сыгналы нізавога друку і прымаюць меры па зьмяшчаных у цэнтральным і раённым друку заметках. Аднак, гэтыя дадатныя факты не мяняюць справы па раёну.

Вынікі рэйду брыгад друку па праверцы рэагаваньня на селькораўскія допісы і лісты па Клімавіцкім раёне, у якім прымалі ўдзел звыш 80 чал. абмяркоўваліся па аб'яднаным пленуме бюро РК і прэзыдыуму райКК-РСІ. Рад кіруючых работнікаў раёну атрымаў спагнаньні за дрэннае рэагаваньне. Аб'яднанае пасяджэньне прыняло пастанову аб вылучэньні спэцыяльных людзей, якія павінны адказваць за своячасовае і дзейснае рэагаваньне на допісы і лісты клімавіцкім раённымі установамі.

Р. СІМХОВІЧ.

„КАЛІ ХОЧАМ, ТАДЫ І АДКРЫВАЕМ"

(Ліст пайшчыка МЦРК)

Хлебная крама № 32, як правіла, ніколі своячасова не адкрываецца. У той час, калі хлеб павінен выдавацца ў ёй з 7 гадзін раніцы, крама адкрываецца са спазьненьнем па паўгадзіны або на гадзіну.

7 кастрычніка быў выпадак, калі работнікі крамы № 32 адкрылі не толькі а 10 гадзіне. У рэзультаце гэтага спазьненьня значная частка рабочых, што абслугоўваюцца крамай, прымушаны былі ісьці па работу не атрымаўшы хлеба.

Калі-ж рабочыя зварачаюцца з запытаньнем да крамніка: «Чаму ў краме работа пачынаецца са спазьненьнем?» — ён адказвае:

— Калі хочам, тады і адкрываем, і даваць аб гэтым справаздачы вам ня зьбіраемся.

Трэба, каб кіраўніцтва **МЦРК** зьвярнула ўвагу на такія грубыя адносіны да спажыўцоў з боку крамнікаў і прыцягнула іх да адказнасьці.

Я. Александровіч.

Адносіны, якіх не павінна быць

(Ліст работнікаў тэатру)

Ня так даўно наш **2-гі Беларускі Дзяржаўны Вандроўны тэатр** пастановаю Наркамасьветы быў накіраваны на пастаянную працу ў гор. **Мазыр.** Прайшло больш двух тыдняў як тэатр пераехаў у Мазыр, але яшчэ ім не пастаўлена ні аднэй п'есы.

Такое становішча тлумачыцца перш за ўсё тымі адносінамі, якімі акружан тэатр і яго калектыў з боку Наркамасьветы і раённых арганізацый.

Да гэтага часу ў тэатру няма мастацкага кіраўніка, адсутнічаюць дэкарацыі.

Зусім недапушчальна пастаўлена справа матар'яльнага забесьпячэньня і культурнага абслугоўваньня работнікаў тэатру. Калі мы прыехалі ў Мазыр, там яшчэ нічога ня было падрыхтавана да прыёму тэатру. Большасьць з нас і зараз яшчэ знаходзіцца без кватэр, сьпяць дзе папала.

Зарплата работнікаў тэатру не дыфэрэнцыявала і вельмі нізкая. Яе ледзь хапае на харчаваньне, не гаворачы ўжо аб вопратцы і кватэры.

Акрамя таго, мы—маладыя артысты—не маем ніякай матчымасьці ў тых умовах, якія створаны для нас у Мазыры, арганізаваць сабе вучобу, павышаць кваліфікацыю.

Іофэ, А. Рудзінскі, Дземянкоў, Бацьвіньнік і інш. (17 подпісаў).

АД РЭДАКЦЫІ: «ЗЬВЯЗДА» чакае неадкладнага тлумачэньня ад Наркамасьветы і мазырскага райвыканкому па пытаньнях, закранутых у лісьце работнікаў 2-га Беларускага Дзяржаўнага Вандроўнага тэатру.

АГЛЯД ДРУКУ

КАНКРЭТНАЯ І ДЗЕЙСНАЯ РАБОТА

„КАМУНАР МАГІЛЕЎШЧЫНЫ"

Важнейшым элемэнтам у рабоце «Камунара Магілеўшчыны» па падрыхтоўцы да новага навучальнага году была шырокая мабілізацыя пралетарскай грамадзкасьці на дапамогу масавай школе ў ліквідацыі карэннага педахопу, які заключаецца ў тым, што «навучаньне ў школе не дае вытрымчальнага аб'ёму агульна-адукацыйных ведаў» (Пастанова ЦК УсеКП(б) ад 5 верасьня 1932 году).

Заслуга газэты ў тым, што яна канкрэтна, з нумару ў нумар, зьвязвала падрыхтоўку да навучальнага году з барацьбой за лік відацкую разрыву памёж тэарытычным навучаньнем і практыкай, і мабілізавала на вырашэньне задач, якія пастаўлены партыяй у галіне школьнага будаўніцтва, ня толькі пастаўнікаў, але і работных заводаў і фабрык.

У гэтым, іменна, ў гэтым прычыны посьпехаў газэты «К. М», праведзячы валёкую работу па растлумачэньні вялізарнага значэньня апошняй пастановы ЦК партыі аб навучальных праграмах і рэжыме ў школе, зусім правільна ставіць канкрэтныя задачы перад грамадзкасьцю заводаў і фабрык:

«... на кожным прадпрыемстве трэба стварыць мэтадычныя брыгады ў дапамогу падшэфнай школе. Мэтадычныя брыгады павінны прыняць актыўны ўдзел у абмеркаваньні і правільным скарыстаньні школьных праграм. Яны аказваюць усямерную дапамогу школе ў арганізацыі палітэхнічнага навучаньня».

Газэта шырока змагаецца за тое, каб дапамагчы настаўніку ўстапавіць правільны школьны рэжым, выкаваць у вучня сьвядомую дысцыпліванасьць, своячасова ўкамплектаваць школы, ліквідаваць прагулы і спазьненьні вучняў на заняткі.

Гэта чкроз тое зьвяно, за якое павінна ўхапіцца кожная раённая і нізавая газэта.

«К. М.» паладжвае пры дапамозе брыгад друку шырокі агляд падрыхтаванасьці школьных будынкаў, кухань, сталовак, буфэтаў, фондаў для забесьпячэньня вучняў, арганізуе праверку наяўнасьці школьнага абсталяваньня, пісьмовых прылад і туг, як і ў іншых пытаньнях, па дапамогу школе прыцягвае шэфаў — фабрыкі і заводы.

Асаблівы ўпор газэта робіць на становішчы палітэхнічнага абсталяваньня, на арганізацыі рабочых пакояў і майстэрань.

У рэзультаце на старонках газэты зьяўляецца ліст рабочых заводу «Чырвоны адраджэнец». Рабочы калектыў, разумеючы, што школа навінна рыхтаваць «пакаленьне, здольнае канчаткова ўстанавіць камунізм», бярэ на сябе рад канкрэтных і падзвычай важных для палітэхнізацыі школы абавязацельстваў.

У прыватнасьці камсамольскі калектыў заводу вылучае 10 лепшых ударнікаў для кіраўніцтва пілянэратрадам школы, а рабочыя — інструктароў па палітэхнізацыі і сац. намесьнікаў загадчыка школы. Калектыў рабочых арганізуе выраб палітэхнічнага абсталяваньня і абсталяваньня для школьнай сталоўкі.

Укамплектаваньне школы вучнямі праводзіцца пры ближэйшым удзеле спэцыяльна вылучаных рабочых брыгад і пры ўдзеле саміх бацькоў.

Усе пастаўнікі ФЗС прымацоўваюцца да закрытага разьмеркавальніка і сталоўкі заводу. Рабочыя лічаць сваім абавязкам забясьпечыць усямернае паляпшэньне матар'яльна-бытавых умоў пастаўніцтва:

«МЫ АБАВЯЗВАЕМСЯ — гаворыцца ў лісьце рабочых «Чырвонага адраджэнца».

— АРГАНІЗАВАЦЬ ШТОДЗЕННЫ КАНТРОЛЬ І ДАПАМОГУ ПА СНАБЖЭНЬНІ НАСТАЎНІКАЎ, ПА ПАЛЯПШЭНЬНІ ІХ МАТАР'ЯЛЬНА-БЫТАВЫХ УМОЎ. ВЫКАНАЕМ НАКАЗ ЛЕНІНА АБ ТЫМ, ШТО Ў НАС НАСТАЎНІК «ПАВІНЕН БЫЦЬ ПАСТАЎЛЕН НА ТАКУЮ ВЫШЫНЮ, НА ЯКОЙ ЁН НЕ СТАЯЎ, НЕ СТАІЦЬ І НЯМОЖА СТАЯЦЬ НІ У АДНЭЙ БУРЖУАЗНАЙ КРАІНЕ»

Калектыў рабочых накіраваў спэцыяльную брыгаду для дапамогі падшэфнаму Гарапскаму сельсавету ў падрыхтоўцы да навучальнага году.

«Чырвоны адраджэнец» зьвярнуўся да ўсіх рабочых магілеўскіх фабрык і заводаў з наступным заклікам:

«АРГАНІЗУЕМ ШЫРОКУЮ ШТОДЗЕННУЮ ДАПАМОГУ ШКОЛЕ, У ЯКОЙ НАВУЧАЮЦЦА НАШЫ ДЗЕЦІ, АКРУЖЫМ ВЯЛІКАЙ УВАГАЙ ШКОЛУ, НАСТАЎНІКА, ВУЧНЯ. СТВОРЫМ САМЫЯ ЛЕПШЫЯ ЎМОВЫ ДЛЯ ІХ ПРАЦЫ. ДАМО ІМ МАГЧЫМАСЬЦЬ ПАШЫРЫЦЬ БАРАЦЬБУ ЗА ЎЗЬНЯЦЬЦЕ ЯКАСЬЦІ НАВУЧАНЬНЯ, ЗА ВЫКАНАНЬНЕ НАВУЧАЛЬНЫХ ПЛЯНАЎ, ПАБУДУЕМ САПРАЎДНУЮ ПАЛІТЭХНІЧНУЮ ШКОЛУ МАРКСА-ЛЕНІНА»

Гэты заклік знаходзіць самы гарачы водгук. «К. М.» пачынае зьмяшчаць адказы шматлікіх прадпрыемстваў.

Рабочыя заводу імя Сталіна, напрыклад, у сваім адказе пісалі:

«... ДА НАШАГА ЗАВОДУ ПРЫМАЦАВАНА ВОПЫТНА-ПАКАЗАЛЬНАЯ ШКОЛА. ШКОЛА Ў 1931-32 НАВУЧАЛЬНЫМ ГОДЗЕ ДАМАГЛАСЯ ПАВЫШЭНЬНЯ ПАСЬПЯХОВАСЬЦІ ВУЧНЯЎ ПАРАЎНАЛЬНА З МІНУЛЫМ ГОДАМ НА 3 ПРОЦ. У ГЭТЫМ ГОДЗЕ ЗАНЯТКІ Ў ШКОЛЕ ПАЧАЛІСЯ СВАЯЧАСОВА».

Рабочы калектыў заводу, улічваючы вялізарныя складаныя задачы, што стаяць перад ФЗС, бярэ на сябе наступныя канкрэтныя абавязкі:

«ВЫЛУЧЫЦЬ АДНАГО КВАЛІФІКАВАНАГА РАБОЧАГА ДЛЯ ДАПАМОГІ Ў АБСТАЛЯВАНЬНІ РАБОЧАГА ПАКОЮ ШКОЛЫ.

**ВЫЛУЧЫЦЬ АДНАГО ІНЖЫНЭРНА-ТЭХНІЧНАГА РАБОТНІКА ДЛЯ КІРАЎНІЦТВА РАБО

БАРЫКАДЫ Ў БЭЛЬФАСЬЦЕ

БАІ БЕСПРАЦОЎНЫХ З ПАЛІЦЫЯЙ

ЛЁНДАН, 13. (ТАСС). У Бэльфасьце адбыліся жорсткія вулічныя сутычкі паміж беспрацоўнымі і паліцыяй. Беспрацоўныя арганізавалі дэманстрацыю на вуліцах гораду, патрабуючы дапамогі.

Улады гораду забаранілі беспрацоўным зьбірацца на вуліцах. У грамадзкіх пунктах разьмясьцілася звыш 2-х тыс. паліцэйскіх, узброеных рэвальвэрамі і вінтоўкамі. Бронавыя аўтамабілі і грузавікі са сталёвымі камэрамі для арыштаваных раз'яжджалі па вуліцах гораду.

Калі паліцыя спрабавала разагнаць дэманстрантаў, **беспрацоўныя аказалі супраціўленьне. НА НЕКАЛЬКІХ ВУЛІЦАХ БЫЛІ ПАБУДАВАНЫ БАРЫКАДЫ.** Рабочыя кідалі ў паліцыю цэглу і каменьні з бруку. Мноства жанчын дапамагалі дэманстрантам, падаючы ім каменьні і цэглу. Паліцыя некалькі раз была вымушана адступаць, але потым прыбылі на бронавіках новыя атрады паліцэйскіх, якія пачалі абстрэльваць беспрацоўных з рэвальвэраў.

Барыкады, якія складаліся пераважна з дрыўляных прадметаў, былі падпалены паліцыяй. З вялікай цяжкасьцю паліцыя адцясьніла два натоўпы беспрацоўных (каля 10 тыс. чалавек) з цэнтральных вуліц. Аднак, жорсткая барацьба працягвалася на бакавых вуліцах. Ня гледзячы на паліцэйскі атонь, беспрацоўныя — мужчыны і жанчыны не разыходзіліся і з крыкамі «мы патрабуем хлеба» разброілі некалькі паліцэйскіх, у тым ліку інспэктара паліцыі.

У горадзе спалена і разгромлена мноства магазынаў. Пашкоджана каменьнямі значная колькасьць трамваяў і аўтабусаў. Разгромлена і спалена некалькі грузавікоў, якія перавозілі прадукты харчаваньня і вугаль. У рэзультаце вулічных сутычак, якія адбываліся цэлы дзень, забіта 3 чал., паранена 100, у тым ліку паліцэйскія і прахожыя. 40 беспрацоўных арыштаваны і пасаджаны ў турму па абвінавачаньні ў спробах да «паўстаньня і забойства». Рабочыя аднаго з бэльфасцкіх прадпрыемстваў забаставалі ў знак салідарнасьці з беспрацоўнымі. Да позьняй ночы ў розных раёнах гораду працягваліся пажары. Выкліканы новыя паліцэйскія падмацаваньні, якія бяспынна прыбываюць у горад. Войскам аддан загад быць у баявой гатоўнасьці.

ПРАГРАМА ПАПЭНА

БЭРЛІН, 12. (ТАСС). На па-зачарговым сходзе Баварскага саюзу прамысловцаў, рэйхсканцлер фон-Папэн выступіў з вялікай праграмнай прамовай.

Пачаўшы сваю прамову з пытаньняў зьнешняй палітыкі, фон-Папэн заявіў:

«Самай галоўнай задачай ураду зьяўляецца аднавіць сувэрэнітэт германскай дзяржавы». Перапоўны да эканамічнай праграмы ўраду, фон-Папэн падкрэсьліў, што ўрад ставіць перад сабой задачу расьсеяць недавер'е і пэсымізм і пераўтварыць супроць цьверджаньня, што эканамічная праграма ўраду ўжо правалілася.

Закрануўшы пытаньні гандлёвай палітыкі фон-Папэн заявіў, што ўрад абвяргае ідэю прыцыповай антархіі. Сьпыніўшыся на пытаньнях унутранай палітыкі, фон-Папэн указаў, што зьмена канстытуцыі зьяўляецца прадпасылкай аздараўленьня гаспадаркі на працяжныя тэрміны. Канстытуцыя адчувае патрэбу ў рэформе.

«Мы хочам, — заявіў Папэн, — стварыць магутную надпартыйную уладу, якая ня будзе мячыкам палітычных грамадзкіх сіл». Фон-Папэн адзначыў, што цэнтр цяжару рэформы канстытуцыі, якча падрыхтоўваецца, заключаецца ў зьнішчэньні дуалізму паміж агульна-германскім і прускім урадамі, што «тэта павінна быць дасягнута зьліяньнем важнейшых органаў выканаўчай улады агульна-германскай і прускай дзяржаў».

Фон-Папэн падкрэсьліў, што германскі ўрад выпрацоўвае праект канстытуцыі з тым, каб ён у гатовым відзе быў прапанаван новаму рэйхстагу пры яго скліканьні.

100.000 кітайскіх валантэраў выступілі супроць японскіх войск

ШАНХАЙ. 13 (ТАСС). Як паведамляе «Чайна-прэс» у раёне ракі Ялу (Мукдэнская правінцыя) пачаліся нябывалыя па сваіх разьмерах ваенныя дзеяньні.

Камандуючы валёнтэрскімі атрадамі Тан Чжу-у адмовіўся выканаць ультыматум Муто (японскі поўнамоцны прадстаўнік у Манчжурыі) аб роспуску антыманчжурскага ўраду, арганізаванага ў Тунхуа. Уздоўж ракі Ялу адбыліся сутычкі паміж кітайскімі валёнтэрскімі атрадамі і японскімі войскамі. Сілы Тан Чжу-у, паводле слоў газэты, налічваюць 100.000 чал., уключаючы 10.000 карэйскіх нацыяналістаў. На дапамогу японскім войскам прыбылі падмацаваньні ў складзе адной дывізіі з Квантунскай армії і зводнага палка, накіраванага з Карэі.

АПЭТЫТЫ ПУ-І

ПЛЯН ЗАХОПУ ЎСЯГО КІТАЮ

ТОКІЁ, 12. (ТАСС). Прыбышы ў Токіё 7 кастрычніка асабісты прадстаўнік Пу-І вядзе перагаворы з выдатным дзеячам японскага ўраду. Паводле паведамленьняў з аўтарытэтных крыніц, ён заявіў, што Пу-І і яго прыхільнікі лічаць **манчжурскі ўрад толькі зыходным пунктам для аднаўленьня манчжурскай манархіі ў Кітаі.** Гэта заява набывае асаблівае значэньне з прычыны паведамленьняў з Чанчуня аб тым, што ў **колах манчжурскага ўраду ведзецца ўзмоцненая падрыхтоўка да прылучэньня правінцый паўночнага Кітаю да Манчжурскай дзяржавы.** У манчжурскіх колах мяркуюць, што далучэньне паўночнага Кітаю да манчжурскай дзяржавы будзе ажыцьцёўлена пасьля захопу правінцыі Жахэ японскімі войскамі. Манчжурскія колы сьцьвярджаюць, што гэта адбудзецца ў канцы бягучага, або ў пачатку будучага году.

* * *

ТОКІЁ. «Сімбун Рэнга» паведамляе, што часьці карэйскай армії ў супрацоўніцтве з квантунскай арміяй прыступілі да ваенных манэўраў у раёне Чанчуня.

СЯЛЯНСКІЯ ПАЎСТАНЬНІ Ў ЗАХОДНЯЙ УКРАІНЕ

ВАРШАВА, 11. Згодна паведамленьня бэрлінскай «Украінішэ карэспандэнц», паўстаньні сялян у Заходняй Украіне набываюць усё больш вострыя формы.

Партызанскія атрады найбольш актыўна выступаюць у раёне Прыпяці, на тэрыторыі каля 100 кілёмэтраў. Партызаны ўмацаваліся ў акопах, якія засталіся ад імпэрыялістычнай вайны. Баі адбываюцца пераважна ноччу. Партызаны трымаюць у сваіх руках ініцыятыву, робячы налёты на польскія ваенныя атрады. Транспарты польскіх параненых салдат сьледуюць па начох з Ковеля ў Люблін.

21 верасьня ўсе польскія пяхотныя часьці былі адцягнуты з раёнаў паўстаньня. Далейшую барацьбу супроць партызан вядуць у сучасны момант узмоцненыя кавалерыйскія атрады і буйныя паліцэйскія сілы, сьцягнутыя з Варшаўскага і Люблінскага ваяводзтваў. Гэта перагрупоўка была выклікана невыстарчальнай падзойнасьцю пяхотных часьцей, як гэта мела месца ў 50 пяхотным палку, які пад Повурскам бязь бою прапусьціў акружаны з усіх бакоў партызанскі атрад. Ня раз групы салдат, пасланыя ў разьведку, пераходзілі на бок паўстанцаў.

«Украінішэ карэспандэнц», абвяргаючы весткі аб недахопе зброі ў паўстанцаў, піша: «Гэту зброю украінскія сяляне маюць яшчэ з часу сусьветнай і украінска-польскай вайны, а часткова яна захоплена ў апошні час у баёх з польскімі акупантамі».

Кавалерыйскія і паліцэйскія сілы акружылі цесным кальцом раёны партызанічыны. Усе вакольныя мясцовасьці наводнены карнымі экспэдыцыямі.

У адным толькі Повуроску паводле прыгавору палявых судоў на працягу апошніх 2 тыдняў павешана каля 60 сялян.

„ГОРАД РОСПАЧЫ"

ВАРШАВА, 11 (Уласн. інфармацыя). Даволі яскравы малюнак, як з прычыны расту чага крызісу замірае эканамічнае жыцьцё Польшчы, як замірацюць яе гарады, падае сацыял-фашысцкі «Работнік».

«Заверце» — некалі прамысловы горад,— піша «Работнік»,— 87 проц. яго насельніцтва складалі рабочыя, якія былі заняты на тэкстыльных фабрыках акцыянэрнага т-ва «Загэрце», а таксама на двух мэталургічных заводах.

Пад ударамі крызісу ўсе гэтыя прадпрыемствы закрыты яшчэ два гады назад. **На вуліцы апынулася дзесяцітысячная армія беспрацоўных, а калісьці квітнеючы горад абернут зараз у горад роспачы і голаду.** Замест радасных, задаволеных жыцьцём рабочых, зараз па вуліцах блукаюць як цені, бледныя, змораныя беспрацоўныя.

Далей орган польскага сацыял-фашызму задае пытаньне—з чаго-ж жывуць гэтыя шырокія масы беспрацоўных? І тут-жа адказвае:

«Калі выйсьці ўлетку вечарам за горад, дык можна ўбачыць, як вялізарныя натоўпы цягнуцца дарогай, нясучы ў руках крыху каласоў, пазьбіраных на зжатых палёх, крыху ягад, грыбоў, вязанку хворасту на плячох і г. д. Некаторыя нясуць прыгаршчы бульбы, выжабраванай на вёсцы. І так з дня на дзень ...абы пражыць яшчэ дзень...»

«На жаль,—сьцьвярджае «Роботнік», — такі малюнак голаду і галечы наглядаецца ва ўсёй Польшчы».

А гэта было летам. Прышла восень, падыходзіць зіма. Людзі па-ранейшаму ня маюць з чаго жыць. «Што будзе,—пытаецца з трывогай «Роботнік»,—калі скончацца, нават гэтыя «рэсурсы да жыцьця», калі зямля пакрываецца сьнегам?»

Сапраўды грозная пара наступае ня толькі для фашысцкай дыктэтуры, але і для яе абаронцаў—сацыял-фашысцкіх лёкаеў. Шырокія працоўныя масы ўсё больш пераконваюцца, што адзіным выхадам з крызісу, голаду і беспрацоўя зьяўляецца пралетарская рэвалюцыя. Яны ўсё больш упарта і зацята штурмуюць цьвярдыні капіталістычнага ладу. Таму ня прыходзіцца дзівіцца трывозе польскага сацыял-фашызму за сваю будучыню і будучыню сваіх гаспадароў.

„БАРАЦЬБА... ПА МЕРЫ МАЖЛІВАСЬЦІ"

ВАРШАВА, 12 (Уласн. інф.). У Варшаве ўжо некалькі дзён адбываюцца пасяджэньні цэнтральнага кіраўніцтва польскіх сацыялістэрэнтаў — так званай «Рады начальнай ПНС». Рада старанна абышла ўсе пытаньні зьвязаныя з непасрэднымі становішчам рабочай клясы Польшчы, сусьветным эканамічным крызісам і ваеннай небясьпекай. Сацыял-фашысцкія правадыры паранцылі не разглядаць гэтых пытаньняў таму, што, як піша лейб-орган ПНС «Роботнік» з часу кракаўскага кангрэсу ПНС (1931 год) і па сёнешні дзень «...няма ніякага зьявленьня».

Каб параліжаваць узрастаючае ў нізох ПНС абурэньне супроць здрадніцкай палітыкі сацыял-фашысцкага кіраўніцтва «Роботнік», камэнтуючы пастановы Рады, на ўсе галасы пачынае... выкрываць капіталізм наогул.

Далей ідзе аналіз «агульнай сітуацыі Польшчы», які заключаецца ў адной дэмагагічнай фразе, што сучасная Польшча стаіць «на сьляпым шляху».

Хваляча з лёкайскай адданасьцю Раду за гэты «аналіз», «Роботнік» пераходзіць да характарыстыкі яе пастановаў. Як і трэба было чакаць, гара нарадзіла мыш. Рада, паводле паведамленьня «Роботніка», пасьля свайго... «бязьлітаснага прыгавору» капіталізму, абмежавалася заклікам да барацьбы... «па меры мажлівасьці». Пастанова, вартая здраднікаў. Рада ўхваліла неабходнасьць «арганізацыі ўсякіх масавых рухаў» таксама... «па меры мажлівасьці». У гэтым, як з запалам піша «Роботнік», і заключаецца «зьмест пастаноў Рады».

Дэмагагічныя манэўры сацыял-фашысцкіх правадыроў ня ў сілах затрымаць нарастаючых хваляваньняў у радавых масах ПНС. Прыходзіцца прасіць дапамогі ў... жандармэрыі. За апошні час на ўсёй Польшчы адбыліся масавыя арышты апазыцыйных пэпэсаўцаў, якія выступілі супроць палітыкі свайго партыйнага кіраўніцтва. Паўфіцыёзны «Ілюстраваны курэр цодзенны» паведамляе аб арышце паліцыяй 15-ці рабочых — пэпэсаўцаў, якія нібыта рыхтавалі «раскол у ПНС».

Канфіскаваны рад нелегальных газэт, надрукаваных апазыцыйнымі пэпэсаўцамі, у прыватнасьці, газэта «Апазыцыйны рабочы» і шматлікія лістоўкі і праклямацыі, падпісаныя «апазыцыйны ПНС».

1000 РАБОЧЫХ ВЫКІДВАЮЦЦА НА ВУЛІЦУ

ВАРШАВА, 12. (Уласн. інф.). У цэлым радзе буйнейшых гарадоў Польшчы адбываюцца новыя масавыя звальненьні камунальных рабочых і служачых. У прыватнасьці, **у Варшаве звальняецца з работы 1000 рабочых** варшаўскага водаправоду.

„ЭКЗАКУЦЫЙНЫ БАТАЛЬЁН"

ЛЬВОЎ, 12. Масавы рух сярод працоўных Польшчы і, асабліва, акупаваных Зах. Беларусі і Зах. Украіны за адмаўленьне плаціць падаткі фашысцкаму ўраду набыла ўсё большыя разьмеры. Для барацьбы з гэтым рухам улады ўжываюць самыя жорсткія рэпрэсіі. З Львову паведамляюць, што тут створан спэцыяльны **«экзекуцыйны батальён»** для спагнаньня падаткаў з насельніцтва. «Батальён» паводле паведамленьняў варшаўскай прэсы налічвае звыш 100 сэквэстратараў (падатковых выканаўцаў).

Аб арганізацыі гароднай гаспадаркі на 1933 г.

Пастанова Савету Народных Камісараў Саюзу ССР

У мэтах прадухіленьня непадрыхтаванасьці, якая паўтараецца з году ў год, краёў і абласьцей да забесьпячэньня рабочых бульбаю і гароднінай (несваячасовая загатоўка насеньня, позьняе і дрэннае правядзеньне сяўбы, прапоўкі і ўборкі, пагарджэньня адносіны да разгортваньня сваіх прыгарадных гаспадарак, дрэнная арганізацыя дэцэнтралізаваных загатовак у глыбінных пунктах, непадрыхтаванасьць тары, хавальняў, неарганізаванасьць перавозак і адгрузак і масавая пагібель гароднины), у рэзультаце чаго мае месца недаснабжэньне рабочых, — Савет народных камісараў Саюзу ССР прапануе Наркамзему Саюзу, Цэнтрасаюзу, КамЗагСПА і мясцовым савецкім арганізацыям правесьці наступныя мерапрыемствы:

1. Забясьпечыць павышэньне ўраджайнасьці бульбы, гароднины і бабовых культур з такім разьлікам, каб ужо ў 1933 годзе скараціць, а ў бліжэйшыя 2-3 гады зьвесьці да мінімуму завоз гароднины ў прамысловыя цэнтры з другіх раёнаў.

2. КамЗагСПА сумесна з НКСпабам і Цэнтрасаюзам не позьней студзеня 1933 г. правесьці прымацаваньне вытвараючых раёнаў да асноўных прамысловых цэнтраў і асобных буйных саўгасаў і калгасаў да вялікіх прадпрыемстваў для снабжэньня іх на працяжны тэрмін.

3. НКЗемам рэспублік, Цэнтрасаюзу і Саюзплодагароднине забясьпечыць у гэтым годзе ўздым зяблёва на ўсёй плошчы прыгарадных земляў, каапэрацыі і саўгасаў, падлягаючых засеву гароднінай і бульбай у 1933 годзе.

4. Адзначаючы, што Наркамзем Саюзу і Цэнтрасаюз ня выканалі поўнасьцю пастановы аб арганізацыі прыгарадных МТС, абавязаць Наркамзем і Цэнтрасаюз закончыць арганізацыю МТС і ўкамплектаваньне іх трактарамі не позьней 1 студзеня 1933 г.

Прадугледзець у кантрольных лічбах 1933 году арганізацыю 200 новых МТС для прыгарадных народных гаспадарак.

5. Абавязаць наркамземы саюзных рэспублік, аблкрайземкіраўніцтвы стварыць пасьяўныя фонды, якія забясьпечаць поўнасьцю план пасеву 1933 году: па бульбе — не позьней 15 лістапада і гароднине — не позьней 1 студзеня, зьвярнуўшы асаблівую ўвагу на стварэньне насенных фондаў цыбулі і моркві і забясьпечыўшы іх неабходнымі хавальнямі на зімовы перыяд.

У 1933 годзе забясьпечыць вырошчваньне насеннага матар'ялу гароднины ў кожнай вытвараючай сыстэме ў колькасьці, якая забясьпечвае поўнасьцю яе патрэбы.

6. Наркамзему СССР, Цэнтрасаюзу і іх мясцовым органам зрабіць заўчасна рамонт і неабходнае папярэньне будаўніцтва парнікоў з разьлікам поўнага і своячасовага забясьпячэньня расадай намечаных да пасеву 1933 году плошчаў, а таксама выгапкі раньняй гароднины.

7. Наркамземам саюзных рэспублік і Цэнтрасаюзу забясьпечыць неабходнае будаўніцтва ў каапгасах, саўгасах і калгасных фермах, якое забясьпечвае першапачатковую прасьцейшую пераапрацоўку гароднины (саленьне, квашэньне, пераапрацоўка таматаў і г. д.), усямерна заахвочваючы прасьцейшую пераапрацоўку і хаваньне гароднины шляхам заключэньня гаспадарчых дагавораў паміж фабрычна-заводскімі прадпрыемствамі і калгасамі.

8. Наркамзему СССР і Цэнтрасаюзу забясьпечыць у 1933 годзе будаўніцтва бульбяных і гародных хавалень у мясцох вытворства, у першую чаргу для хаваньня насеньнікаў.

Старшыня Савету народных камісараў Саюзу ССР В. МОЛАТАЎ (СКРАБІН).

Кіраўнік спраў Савету народных камісараў Саюзу ССР П. КЕРЖАНЦАЎ.

Масква, Крэмль, 8 кастрычніка 1932 г.

ХРОНІКА ПАДРЫХТОЎКІ ДА XV КАСТРЫЧНІКА

ЯК БУДЗЕ ВЫГЛЯДАЦЬ МЕНСК. Да Кастрычніцкіх дзён Менск упрыгожваецца па адзінаму агульна-гарадзкому пляну, распрацаванаму гарадзкой камісіяй з удзелам лепшых мастацкіх сіл. У афармленьні гораду будуць адлюстраваны наступныя тэмы: «Роля КП(б)Б у Кастрычніку на Беларусі», «У нас і ў іх» — супрацьстаўленьне БССР з Заходняй Беларусьсю, «Пяцігодка пабудовы бясклясавага грамадзтва», «Сацыялістычнае спаборніцтва і ўдарніцтва», «Рыхтуйцеся да працы і абароны», «Культура нацыянальная па форме і сацыялістычная па зьместу», шэсьць умоў тав. Сталіна, «Тэмпы, якасьць і праверка», «Магутнасьць Чырвонай армії».

Цэнтральным месцам афармленьня прызначан пляц Волі, а асноўнымі пунктамі — будынкі ЦК і гаркому партыі, Эльвод, кіно «Чырвоная зорка», вакзал, гарадзкі тэатр. На пляцы Волі будуць устаноўлены вялікія партрэты ЛЕНІНА І СТАЛІНА — вышынёю ў 7 мэтраў, зробленыя фатаграфічным спосабам.

Сквэр на пляцы Волі прыстасоўваецца для і 8 для чырвонаармейцаў і школьнікаў.

КІНО. Белдзяржкіно арганізуе здымку на фабрыках і заводах падрыхтоўчых момантаў да Кастрычніка і лепшых ударнікаў з тым, каб зараз-жа гэты матар'ял дэманстраваць у кіно-хроніцы. 6, 7 і 8 лістапада ў 6 пунктах гораду будуць працаваць адкрытыя экраны. Вячэрнія сэансы 6 і 7 лістапада ва ўсіх менскіх кіно-тэатрах будуць дэманстравацца бесплатна для фабрык і заводаў, а 7 арганізацыі алей ударнікаў і дошак гонару лепшых прадпрыемстваў.

На высокіх будынках і вышках СПА будуць устаноўлены магутныя пражэктары і пабудаваны розныя сьветавыя эфэктазідовішчы.

Па ўсім горадзе да сьвята праводзіцца зьмена сьцягаў. На мастацкае афармленьне сталіцы адлушчана 8.000 мэтраў чырвонай матэрыі.

Вялікая ўвага зварачаецца на афармленьне рабочых акраін і жакатаўскіх дамоў. Да гэтай работы прыцягнут гаржыласюз.

Для кансультацыі ў рабоце па мастацкім афармленьні Менску запрошаны лепшыя ў гэтай галіне спэцыялісты з Масквы.

Паведамленьне

Сьпіс дакладчыкаў, вылучаных Менгаркомам КП(б)Б для праправоўкі вынікаў кастрычніцкага пленуму ЦК УсеКП(б)

Жаброўскі — завод імя Варашылава; Рыскін — зав. «Камунар», Галадзед — зав. «Бальшавік»; Жолудаў (гарКК) — зав. імя Молатава; Кавальчук — ф-ка «Кастрычнік»; Чарнушэвіч (ЦК) — абутковая фабрыка; Ягораў (ЦК) — зав. «Ударнік»; Ленцнэр (ЦК) — Шклозавод; Шпэхтараў (ГК) — ф-ка «Камунарка»; Башмачнікаў (ГК) — Хлебазавод; Каржанеўіч (ЦК) — Шчотачная ф-ка, Балабанаў (ЦК) — ф-ка «8 сакавіка»; Дзяніскевіч (ГК) — ф-ка імя Крупскай; Картукоў (ЦК) — друкарня імя Сталіна; Балцін (НКС) — Мясакамбінат; Малей (ГК КСМ) — ф-ка «Беларуска», Хадзісевіч (ГКК) — скарняжная ф-ка; Каранеўскі (гарсавет)—рымарная ф-ка; Шэйнін (Загатлён) — зав «Беларусь»; Кудрасў (гарпрафсавет) — хімфармзавод; Турлай (ЦКК) — «Чырвоны Хімік»; Андросенка (Белкавалгсаюз) — зав. «Пралетары»; Шэліма — зав. «Чырвоная зорка»; Конюкаў (АБВШ) — «Чырвоны тэкстыльшчык»; Барэн (СНК) — шпалерная фабрыка: Матусевіч (СНК)—ФЗВ «КІМ»; Красоўскі (СНК) — лямпавая фабрыка; Валодзька (гарсавет) — электрастанцыя; Гольшмідт (ЦКК) — абутковая майстэрня імя гарсавету; Хэйфец («Рабочий») — удзільскур; Шулькін (гарпрафсавет) — грушком харчавікоў; Элькін (СНК) — малочна-кісьлотн. завод; Пазокевіч (ЦК) — УЭА; Гурэвіч (ЦКК) — сыпіртазавод; Гершман (ЦК) — БСКА; Чарвякоў — «Полымя рэвалюцыі»; Іваноў (ЦК) — служба цягі; Лычоў — МРВ. Закоўскі — служба эксплёатацыі; Ленцнэр (НК Здраў) — Саюзтранс; Тамашэўскі (Калтастэнтр) — Трансапартпрэст; Герцовіч (ЦК ЛКСМ) — служба шляху; Войтаў (ЦК) — ДЗ 6; Бэнэк (СНК) — Белдзяржбуд, Кудзелька (ЦК) — Менбуд; Баскін (НКП) — Дом ураду; Петруковіч (Галоўміліцыя) — Гаржыласюз; Масюкоў (НКЗ)—УНР 56; Сокалаў (НКЗ) — УНР 18; Казачок (ЦК) — 7-я дарожн. дыстанцыя; Дзюковіч (ЦК) — Водавазпалтрэст; Стракоўскі (Наргасвучот) — Энэргабуд; Дунец («Аксцябр») — 1-ы грушком будаўнікоў; Брагінскі («Зьвязда») — цагельны камбінат № 1 «Чырвонае урочышча»; Файнбэрг (НКЮ) — цагельні Менбуду; Бондар — цагельня № 3; Бялуга (НКА) — цэнтральныя майстэрні Белдзяржбуду; Ашаровіч (ЦК) — АБВШ; Быскін — Астрахапскі К. П.; Аўчыньнікаў (Камвуз) — полк ДПУ; Дамбаль (БАН) — Дом Чырвонай армії; Паніматка (НКЗ) — пэйзаж міліцыі.

РЭЗЭРВ.

Хаскін (БКС); Верба (БКС); Драгілаў (КІЖ); Лур'е (Камвуз); Левін (Камвуз); Краўчук (Камвуз); Агульнік (Камвуз); Радзецкі (Камвуз); Слуцкі (ГК КСМ); Руды (КІЖ); Львовіч (Камвуз); Зярніцкі (КІЖ); Шпітальнік (КІЖ); Чорнабродаў (НКА); Аксяцкаў, Ротмэр (хэм.-тэхн. інст.); Нятрушэня, Чудноўскі, Кісьцяновіч, Раманенка (Дзяржплян); Растоўская (НКШП); Вільковў (хэм.-тэхн. інст.); Жук (Дзяржплян); Мэсроўіч (ВКЗ); Савіч (інст. гісторыі партыі); Зяньковіч (гарАПА); Савіч (радыё-цэнтр); Южык (Белмедтэхнікум); Макоўскі (сэкрэт партактыву); Выдра (Камвуз); Раманчук (інстытут гіст. партыі); Труе (інст. гіст. партыі); Любін (ЗКУ); Савіч (ЗКУ); Халявін (ЖКУ); Горын (БАН); Гурчэнка (БДК). Пятровіч (Дзяржплян).

Адказны рэдактар Г. Н. БРАГІНСКІ.

„ЧЫРВОНАЯ ЗОРКА" Пач.:6,7-30-9,10-30 Каса—ад 1 гадз. РЭЎНАСЬЦЬ драмаў. 6 частк Кіно-хроніка САЮЗКІНО.

„ІНТЭРНАЦЫЯНАЛ". Пач.:6,7-30,9.10-30 Дзенны с—у 2 г. АДЗІНАЦЦАЦЬ ЧАРЦЕЙ Звыш праграмы—кіно-хроніка САЮЗКІНО.

Пралетары НАТЭЛА у гал. ролі Ната ВАЧНАДЗЭ Дзенныя дзіцячыя сэансы Сапраўдныя паляўнічыя

СПАРТАК Пач.: 7, 8-20, 9-40, 11. Каса—з 5 г. Новы заежны фільм Абшарпаныя ветразі КІНО-РАМАН у 8 частках.

МЕНКАМГАС абвяшчае ДАДАТКОВЫ НАБОР ВУЧНЯЎ у школу ФЗВ камунальных прадпрыемстваў на мэханічнае банна-прачэчн. аддзяленьне, якое рыхтуе мэханікаў для мэханічных пральняў.

Прымаюцца асобы, скончыўшыя ня менш 6-ці груп сямігодкі і не маладзей 15 гад.

Вучні забясьпечваюцца стыпэндыяй у разьмеры 30 руб. у месяц з паскуповым павялічэньнем у залежнасьці ад пасьпяховасьці вучняў.

Спаўнаньне вучняў прадуктамі ўтвараецца нарадзе з рабочымі.

Усе прыяжджаючыя вучні забясьпечваюцца інтэрнатам.

Заявы прымаюцца да 25 кастрычніка ў школе ФЗВ— пляц Волі, 2, Менкамгас.

Да заявы патрэбны дакументы аб адукацыі, узросьце, сац. становішчы і здароўі.

МЕНКАМГАС.

Беларускі вучэбны камбінат сувязі абвяшчае ДАДАТКОВЫ НАБОР СТУДЭНТАЎ на дзенны і вячэрні тэхнікум сувязі на аддз.: тэлеграфнае, тэлефоннае і радыё.

У вячэрні тэхнікум сувязі і без адрыву ад вытворчасьці і на базе сямігодкі і дзевяцігодкі:

120 чал. на 1-шы курс з 4-гадовым тэрмінам вучобы
30 чал. з паўтара гадовым тэрмінам вучобы
30 чал. на 3-ці курс.

У дзенны тэхнікум сувязі з адрывам ад вытворчасьці:

90 чал. з паўтарагадовым тэрмінам вучобы
30 чал. на 3-ці курс.

На 9-месячныя вячэрнія радыё-тэхнічныя курсы II рангу:

30 чал. без адрыву ад вытворчасьці.

Неабходныя дакументы, як для ўсіх індустрыяльных тэхнікумаў у арміялах накіроўваць па адрасу: г. Менск, Кожаруўка, Падлесны зав. За даведкамі зварачацца па тэлефону 12-86. Прыём заяў працягваецца да 25-X 1932 г.

Дырэктар Асядоўскі.

Паведамляецца, што 20-X—32 г. АДБУДЗЕЦЦА ТЫРАЖ 1-й УСЕСАЮЗНАЙ ЛЁТАРЭІ на дапамогу інвалідам вайны, дэмабілізаваным чырвонаармейцам і інш.

Усе арганізацыі, якія атрымалі для рэалізацыі білеты, павінны не позьней 18-X-32 г. унесьці грошы і здаць нерэалізаваныя білеты ў Горкабас—пляц Волі, 2.

Гаркамітэт па рэалізацыі білетаў.

Аршанскі мясапрамысловы тэхнікум АБВЯШЧАЕ ДАДАТКОВЫ НАБОР на 1-шы курс убойна-разьдзелачнага аддзяленьня з адукацыяй ня ніжэй 7-8 груп.

Таксама праводзіцца набор на 1-шы курс навукова-бэконнага аддзяленьня з адукацыяй ня ніжэй 7-годкі.

Усе паступаючыя падвяргаюцца іспытам, згодна пастановы ЦВК СССР.

Прынятыя у тэхнікум забясьпечваюцца інтэрнатам і стыпэндыяй на пасьпяховасьці.

Дакументы падаваць да 25 кастрычніка на адрасе: г. Ворша, Ленінская, 16, Мясапрамысловы тэхнікум.

ДЫРЭКТАР ФАМІН.

Даводзіцца да ведама ўсіх грамадзян, якія маюць ТАЛЁНЫ на права індывідуальнага заказу АБУТКУ ЦІ ГАТОВАГА АДЗЕНЬНЯ, ШТО ВЫДАНЫЯ ТАЛЁНЫ да 1-га кастрычніка з 17 кастрычніка будуць лічыцца НЕСАПРАЎДНЫМІ.

Хадайніцтва аб працягненьні тэрміну ня будуць прымацца пад увагу.

БЕЛКААПСАЮЗ.

ПУБЛІКАЦЫІ аб згубе дакумантаў у газ. „Зьвязда" НЯ ПРЫМАЮЦЦА

ПАСТАНОВА № 45 Менскага Гарадзкога Савету Рабочых, Сялянскіх і Чырвонаармейскіх Дэпутатаў 10 кастрычніка 1932 г. гор. Менск.

Праўвядзеньне ўсеагульнага абавязковага навучаньня для малапісьменных.

У адпаведнасьці з пастановай СНК БССР ад 4 жніўня 1932 г. пра ўвядзеньне ўсеагульнага абавязковага навучаньня для малапісьменных, Менскі Гарадзкі Савет пастанаўляе:

1. Увесьці з 1-га кастрычніка 1932 году на тэрыторыі гораду Менску і сельсаветаў яго раёну ўсеагульнае абавязковае навучаньне за 4-х гадовую палітэхнічную школу для рабочых прадпрыемстваў, саўгасаў, МТС і членаў прафсаюзаў ва ўзросьце ад 10 да 45 год, для калгасьнікаў, бедняковай, серадняковай—аднасобнікаў ва ўзросьце ад 16 да 40 год.

2. Адказнасьць за ліквідацыю малапісьменнасьці для рабочых на прадпрыемствах і ўстановах усясьцяж на адміністрацыю з прыцягненьнем прафсаюзных арганізацый. У адносінах ліквідацыі малапісьменнасьці сярод калгасьнікаў, усясьцяж адказнасьць на праўленьні калгасаў, з прыцягненьнем грамадзкіх арганізацый вёскі.

3. Абавязаць усе ўстановы, прадпрыемствы і арганізацыі даваць для заняткаў з малапісьменнымі, якія працуюць у гэтых установах, прадпрыемствах, або арганізацыях—памяшканьні, забясьпечыць іх апаламі і асьвятленьнем, а таксама неабходным абсталяваньнем.

4. Абавязаць усе прадпрыемствы, саўгасы, калгасы, дзяржаўныя, каапэрацыйныя, грамадзкія ўстановы і арганізацыі да 15 кастрычніка г. г. зрабіць дакладны ўлік малапісьменных, якія працуюць, і весьці штодзённы ўлік пакуль паступаючых малапісьменных на работу.

5. Асобы, парушаючыя гэтую пастанову, падлягаюць штрафу да 100 р., або прымусовай рабоце да 15 дзён.

6. Нагляд за выкананьнем гэтай абавязковай пастановы ўскладаецца на Менгарвыканкам і сельсаветы.

Нам. старшыні Менскага Гарадзкога Савету Каранеўскі.

Сакратар Люцько.

Інстытут філёзофіі АН БССР. 14 кастрычніка, у 6 гадз., у пасяджэньні інстытуту філёзофіі АН БССР (пляц 10) адбудзецца пасяджэньне інстытуту філёзофіі. Парадак дня: спрачні па дакладу т. Левіна Я. „Ленінскае вучэньне аб партыйнасьці філёзофіі". Запрашаюцца жадаючыя.

Дырэкцыя інстытуту філёзофіі.

МЯНЮЮ пакой у Менску на кватэру у Бабруйску. Даведацца ад 5-8 г. веч. Чырвонаармейская 18-1, Нісхасаа.

У аддзел аб'яў званеце па тэлефону № 7-81

Абавязковая пастанова № 46. Менскага Гарадзкога Савету г. Менск. 10 кастрычніка 1932 г.

Аб забароне зьяўляцца на вуліцах і грамадзкіх мясцох у п'яным відзе.

МЕНСКІ ГАРАДЗКІ САВЕТ ПАСТАНАЎЛЯЕ:

1. Забараніць зьяўленьне на вуліцах і ў грамадзкіх мясцох у стане відавочнага апяненьня.

УВАГА: асобы, якія зьяўляюцца на вуліцах і ў грамадзкіх мясцох у п'яным выглядзе, дастаўляюцца ў міліцыю, дзе і затрымліваюцца да выцьверазеньня.

2. Нагляд за выкананьнем гэтай пастановы ўскладаецца на міліцыю і сельскія саветы.

3. Вінаватыя ў парушэньні гэтай абавязковай пастановы падлягаюць адказнасьці ў адміністрацыйным парадку ў г. Менску штрафу да 100 руб. або прымусовай працы да 15 дзён, а ў сельскай мясцовасьці—штрафу да 10 р., або прымусовай працы да 2 дзён.

4. Гэтая абавязковая пастанова ўваходзіць у моц праз 7 дзён з дня апублікаваньня.

Намесьнік старшыні Менскага гарсавету Каранеўскі.

Сакратар Люцько.

Турскі тэхнікум насеннаводзтва лугавых траў працягвае набор студэнтаў на 1-шы курс на 1932-33 навучальны год.

Прыём заяў да 20 кастрычніка.

Прымаюцца асобы з асьветай у аб'ёме 7-годкі, а для пераросткаў, рабочых і калгасьнікаў—за 6 груп сямігодкі. Студэнты забясьпечваюцца інтэрнатам і стыпэндыяй на агульных падставах. Дакументы аб асьвеце, аб узросьце, аб стане здароўя, медычную спраўку, аб сац. паходжаньні, дзьве фота-карткі і анкету накіроўваць па адрасе: п-а Гадзілавічы, Рагачоўскага раёну, прыймовай камісіі Турскага насеннаводнага тэхнікуму.

Дырэкцыя.

Чачэрскі сьвінагадоўчы тэхнікум працягвае НАБОР студэнтаў на 1-шы курс да 1 лістапада 1932 г.

Адпачасова праводзіцца набор курсантаў на падрыхтоўчае аддзяленьне для падрыхтоўкі ў тэхнікум.

Студэнты і курсанты забясьпечваюцца стыпэндыяй